№ 6 (316) 14 лютага 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Выбар Уладзімера Мацкевіча



Ток-шоў «Выбар» на АНТ: чаму некалькі перадачаў так і ня выйдуць на экраны.

старонка 2

### Канфлікт вакол Іраку

Беларускі погляд на праблему.

старонка 3—5

### Намі будуць кіраваць дактары

Хто прэтэндуе на месца ў Менскім гарсавеце.

старонка 10

### Сабака і Граждан сьвяткуюць Дзень закаханых

старонка 16

# З «мэрсэдэсаў» на «фальксвагены»

**Летась беларусаў паменела, а легкавікоў пабольшала. 9 млн. 960 тыс. чалавек насельніцтва краіны цяпер валодаюць 1,5 млн. прыватных легкавых аўтамабіляў.**

**21% іх сканцэнтраваны ў сталіцы. Тут на тысячу жыхароў прыпадае 188 аўто (у сярэднім па Беларусі — 151). Сярод абласьцей найбольш машынаў маюць гарадзенцы (171 на тысячу), найменш — магілёўцы (122).**

**Аўто для беларуса — зусім не раскоша. Летась у краіне паболела прыкладна на 75 тысячаў аўтамабіляў, аднак толькі 3 тысячы зь іх — новыя. У сувымернай з намі Вугоршчыне штогод рэгіструюць 160 тысячаў новых аўтамабіляў, у Чэхіі — 200 тысячаў.**

**Шыкоўных аўто ў краіне няшмат. Большасьць прэстыжных машынаў зарэгістраваныя ў Менску: 79% «ягуараў» (усяго іх у краіне цяпер 136), чвэрць «поршэ» (усяго іх 134), 65% «лінкальнаў» (49), 22 з 38 «кадылакаў», трэцяя частка «джыпаў» ды 42% «лэнд-ровэраў» (139).**

**Штогод беларусы набываюць ня больш за 80 аўто, якія каштуюць больш за 50 тыс. даляраў, каля 300 па цане ад 25 да 50 тысячаў ды прыкладна 600 за 12—22 тыс. даляраў. Астатнія новыя легкавікі (каля 2 тысячаў) разыходзяцца за 10—12 тыс. даляраў. Большасьць машынаў, якія трапляюць у Беларусь, ужо 7—10 гадоў круцяць кілямэтры на лічыльніку. На другім месцы сярод зарэгістраваных аўто — 4—6-гадовыя. Але аўтааматары больш ня гоняцца за вельмі ўжо танным «таварам». У 2002 г. колькасьць аўтамабіляў, выпушчаных да 1990 г., зьменшылася проці 2001 г. на 10%.**

**Працяг на старонцы 7.**



IREX-PROMEDIA

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Як вы ставіцеся да вайны ў Іраку?

**Апазыцыйныя партыі пакуль ня выказаліся наконт вайны ў Іраку. У Лукашэнкі ёсьць пазыцыя, у апазыцыі — няма. Пакуль апазыцыя маўчыць, пазыцыю Лукашэнкі можна лічыць пазыцыяй усёй Беларусі. Абсалютная большасьць беларусаў супраць вайны. Антываенная пастава дала б апазыцыі ачкі. Раз апазыцыя маўчыць, мо яна за вайну? Вайна ў Іраку цынічна выгадная беларускай незалежнасьці, бо прывядзе да падзеньня цэнаў на нафту. Але і пра гэта маўчыць апазыцыя. Каб палітыкі нарэшце загаварылі, мы правялі апытаньне «НН».**

**Пятро Краўчанка**, былы пасол у Японіі: Гэта будзе вайна дзьвюх цывілізацый, якая зьнішчыць і абрыне сусьветны правапарадак. Яшчэ ў XVI ст. Статут Вялікага Княства Літоўскага заклаў прынцыпы мірнага суіснаваньня дзяржаваў. Нашы продкі зрабілі гэта першымі ў Эўропе. Толькі пра гэта ніхто ня ведае…

**Павал Казлоўскі**, былы міністар абароны: Вырашыць праблему і памяняць рэжым Хусэйна без крыві й вайны — гэта быў бы разумны крок міжнароднай супольнасьці.

**Алесь Анціпенка**, філёзаф: Я не пацыфіст, але да магчымай вайны стаўлюся нэгатыўна. Вайна — гэта гвалт, крызыс інтэлекту, каштоўнасьцяў, адносінаў. Таму гэта ня ёсьць лепшы сродак вырашэньня праблемаў.

**Сяргей Касьцян**, дэпутат палаты прадстаўнікоў: Гітлер у 30-я гады вёў барацьбу за сусьветнае панаваньне, за «свабоду» і «дэмакратыю», а на самай справе забіваў, рабаваў і паліў. Дакладна так робіць і кіраўніцтва ЗША. Я не вінавачу амэрыканскі народ, які ня хоча вайны, але асуджаю палітыку амэрыканскага ўраду ў адносінах да Іраку і іншых краінаў, у тым ліку і Беларусі.

**Генадзь Дылеўскі**, дэпутат палаты прадстаўнікоў: Ваююць палітыкі, а церпяць ад гэтага простыя людзі. Таму спачатку трэба давесьці, што хтосьці — тэрарыст, і толькі пасьля пачынаць зь ім вайну.

**Аляксей Янукевіч**, сябра Сойму БНФ: Я, як і любы чалавек, да вайны стаўлюся адмоўна. Але, разам з тым, калі ад Іраку можа зыходзіць небясьпека заходняй цывілізацыі, я падтрымліваю пазыцыі ЗША і Вялікабрытаніі. Хаваючы інфармацыю пра выраб хімічнай зброі, Ірак не пакідае шанцаў на мірнае ўрэгуляваньне.

**Алена Скрыган,** намесьніца старшыні ПКБ: Я супраць гэтай вайны не таму, што падтрымліваю рэжым Хусэйна. Мне шкада людзей, якія залежаць ад волі лёсу. Акрамя таго, вайна — гэта і экалягічная катастрофа. Мы бачылі, што было пасьля «Буры ў пустыні», цяпер жа будзе яшчэ горш.

**Анатоль Лябедзька**, кіраўнік АГП: Мяне больш хвалююць не такія глябальныя праблемы, а сытуацыя ў Беларусі. Што датычыць канфлікту ў Іраку, то міжнародная супольнасьць спрабуе вырашыць праблему палітычнага рэжыму, які там існуе. Я б ні за якія грошы не паляцеў бы туды на самалёце, як некаторыя прадстаўнікі Беларусі, якія хочуць абараніць Ірак ад бамбёжак.

**Галіна Сямдзянава**, намесьніца старшыні БНФ: Я да любых ваенных дзеяньняў стаўлюся адмоўна. Канфлікты трэба вырашаць мірным шляхам.

**СЁ**

# Выбар Уладзімера Мацкевіча



**Нядаўна на канале АНТ стартаваў новы праект — ток-шоў «Выбар». Адным зь ягоных сюрпрызаў было тое, што ў якасьці вядучага выступіў палітоляг Уладзімер Мацкевіч. Сябар апазыцыйнае партыі кіруе тэлепраграмай. Яшчэ перад прэзыдэнцкімі выбарамі ён даказваў у «НН», што галасаваць трэба ня супраць усіх, а за Ганчарыка. Чаму ён пайшоў працаваць на АНТ? Ці гэта прыкмета лібэралізацыі? Гутарка з У.Мацкевічам.**

**Уладзімер Мацкевіч:** З тэлебачаньнем я пачаў працаваць яшчэ падчас падрыхтоўкі перадачы Паўла Шарамета «Праспэкт». Потым былі іншыя праекты. Няблага разумеюся ў гэтай справе. Хочацца зрабіць добрую перадачу, ад якой была б карысьць і якая мела б сэнс. Таму, калі зьявілася прапанова весьці ток-шоў, я пагадзіўся. Мне пасуе быць першапраходцам. Праца для мяне вельмі цікавая, але й няпростая. У гэта цяжка паверыць, але факт: мы ня ўмеем размаўляць, крытыкаваць, займаць пазыцыю. Так цяжка зь людзьмі, якіх запрашаеш на перадачу!..

**«НН»: Як сябры і знаёмыя паставіліся да Вашага зьяўленьня на АНТ?**

**У.М.:** Сябры цалкам нармалёва, а знаёмых у мяне шмат, і тут даводзілася чуць рознае. Некаторыя кажуць: «Даўно ведалі, што ты — гэбіст…»

**«НН»: Ці будзеце Вы цяпер зьяўляцца ў апазыцыйным друку?**

**У.М.:** За апошнія гады я цалкам адышоў ад актыўнае палітыкі.

**«НН»: Вы захавалі сяброўства ў Аб’яднанай грамадзянскай партыі?**

**У.М.:** Так, але я выйшаў зь яе кіроўных органаў.

**«НН»: Тэмы для перадачаў выбіраеце самі ці працуе каманда?**

**У.М.:** У мяне ёсьць каманда, але яна «цякучая». Я — кіраўнік праекту, але не ўладальнік — ні каналу, ні грошай. Я многае павінен узгадняць. Трэба ўлічваць і палітыку каналу.

**«НН»: Паводле нашых зьвестак, адна з падрыхтаваных перадачаў ток-шоў «Выбар» не пайшла ў этэр…**

**У.М.:** Каб жа адна! Болей.

**«НН»: А зь якой прычыны?**

**У.М.:** З розных. Напрыклад, першыя праграмы, якія мы здымалі пры канцы мінулага году: нешта з напрацаванага «выгарала», а рабіць гэта бязь нейкага натхненьня не атрымліваецца. Прыйдзе час, мы да іх вернемся. Адна перадача ня выйшла, бо мы яе «замарозілі», адклалі. Але і яна зьявіцца.

**«НН»: Перадачы ідуць у запісе?**

**У.М.:** Мне не хацелася б распавядаць пра тэлевізійную кухню. Дакладна гарантую, што галасаваньне ідзе ў рэальным часе, як кажуць, «у жывым этэры», у панядзелкі. А ў нядзелі, зразумела, паўтор.

**«НН»: Ці сапраўды ў «Выбар» тэлефануюць тысячы людзей?**

**У.М.:** Так. Гэта можна праверыць, бо зьвесткі ёсьць на сайце «Белтэлекаму».

**«НН»: Вы новы чалавек на АНТ. Вам падабаецца атмасфэра, якая там пануе? Там насамрэч робіцца новае беларускае тэлебачаньне?**

**У.М.:** Так. Супрацоўнікі АНТ імкнуцца стварыць прафэсійны канал. Хоць усе разумныя людзі і ўлічваюць умовы, у якіх мы працуем.

**Гутарыў С.Ё.**

• 10 РАДКОЎ РЭДАКТАРА •

# Войны — бяз нас

Адзін знаёмы вярнуўся з Тэгерану. І што, вы думаеце, іранская моладзь?.. Моліцца, каб Буш з Багдаду павярнуў на Ісфаган і выгнаў прэч усіх аятолаў!

Так, існуе і «другі Ўсход». Ня менш дзівосным стала адкрыцьцё, што і Захады таксама — два. Унутры NATO па стаўленьні да Іраку пралёг раскол.

Беларуская апазыцыя, сымпатыі якой дзеляцца між Масквой, Вашынгтонам, Бэрлінам і Варшавай, у такой прыгодзе разгублена маўчала. Затое Лукашэнка за словам у кішэню ня лез. І выгадаў у рэйтынгу. Але ў сьвеце Беларусь чарговы раз палічылі за азіяцкую краіну.

Той, хто пасьля ўсіх войнаў XX ст. будзе выступаць «за вайну», простаму беларусу падасца шалёным. Марс — не беларускі Бог. Зразумець амэрыканцаў нам настолькі ж складана, як некалі Руста, які прызямліўся на Красную плошчу.

У адным сыходзяцца ўсе ў Менску: беларускі салдат не павінен пераступаць межы краіны. Войны — бяз нас.

**Андрэй Дынько**

• IN MEMORIAM •

# Аляксандар Мыльнікаў



**3 лютага памёр старшыня Пецярбурскай асацыяцыі беларусістаў Аляксандар Мыльнікаў.** Разьвіталіся зь ім у Кунсткамэры, у залі Афрыкі й Палінэзіі — паміж муляжоў нэграў зь дзідамі й шаманскіх рытуальных бубнаў. На Серафімаўскія могілкі паехалі ня ўсе — большасьць разыходзіліся праз моцны сьнегапад пахмурнага лютаўскага дня ў розныя навуковыя ўстановы Пецярбургу. Нябожчык быў чалавекам вельмі шырокіх інтарэсаў і меў сувязі з калегамі ў розных колах.

Спадар Аляксандар напісаў больш як 520 навуковых прац, пад яго рэдакцыяй выйшла 75 кніг, ён быў апанэнтам падчас абароны больш за паўсотні кандыдацкіх і больш як дзесяці доктарскіх дысэртацый.

Як беларусіст, большасьць сваіх прац прысьвяціў Скарыну. Цана раптоўнай і нечаканай страты прафэсара Аляксандра Мыльнікава вельмі вялікая, хто яго заменіць, не зусім пакуль ясна.

**Мікола Нікалаеў, Санкт-Пецярбург;**
**Андрэй Катлярчук, Стакгольм**

# Паэт і ваяр



**18 студзеня ў Магілёве памёр паэт і вэтэран нацыянальнага руху Ўладзімер Сіўко.** Было яму 87 гадоў. У.Сіўко нарадзіўся 7 студзеня 1916 г. у Менску, калі ягоная сям’я ехала ў бежанства з в.Ачукевічы (Наваградчына). У 1933 г. ён скончыў Наваградзкую беларускую гімназію, служыў у польскім войску, браў удзел у нямецка-польскай вайне 1939-га. Пры «першых саветах» працаваў дырэктарам Ачукевіцкай школы. Падчас нямецкай акупацыі Сіўко, як і шмат іншых маладых настаўнікаў, стаў афіцэрам у Наваградзкім эскадроне Рагулі (зь вясны 1944-га камандаваў ім). У жніўні 1945 г. яго арыштавала савецкая дзяржбясьпека. Доўгія гады канцлягераў адбываў на Калыме. Пасьля вызваленьня жыў у Любчы і толькі незадоўга да сьмерці пераехаў да дзяцей у Магілёў.

Пісаў вершы. Адзін з самых вядомых твораў «На магілу «З.К.», які некаторыя дасьледчыкі памылкова прыпісваюць Ларысе Геніюш, Сіўко напісаў на Калыме ў 1952 г. У 1996 г. у Наваградку выйшла кніга вершаў У.Сіўка «Позьнія кветкі».

Уладзімер Сіўко пакінуў у жалобе жонку Вольгу, дачок, унучак і праўнукаў, сяброў на Бацькаўшчыне і за мяжой. Сьветлая памяць!

**Сяргей Ёрш**

# Джон Глен: «Калі б людзі не рызыкавалі, Калюмб не адкрыў бы Амэрыкі»




**Джон Глен, найстарэйшы амэрыканскі астранаўт (нар. у 1921 г.): «Калі праз дзьве хвіліны пасьля зьнікненьня сыгналу служба кантролю палёту ня здолела зьвязацца з «Калюмбіяй», я зразумеў, што адбылося нешта жудаснае. Я сам, калі вяртаўся на Зямлю ў 62-м, страціў сувязь з службай кантролю, але ўсяго на хвіліну.**

**Трагедыя з «Калюмбіяй» не затармозіць праграмы палётаў у космас. Гэтага не жадала б ні каманда «Калюмбіі», ні каманда «Чэленджэра», ніводзін з астранаўтаў, што загінулі падчас касьмічных дасьледаваньняў.**

**Калі б сьмерць стрымлівала сьмелыя чалавечыя праекты, у нас не было б цяпер чыгункі ці хмарачосаў, у часе пабудовы якіх гінулі працаўнікі. Калі б людзі не рызыкавалі, Калюмб не адкрыў бы Амэрыкі. Мы выправім памылкі, мы ўлічым гэты жахлівы ўрок і пойдзем далей.**

**Праграма, якую ажыцьцяўляе НАСА, бясьпечная настолькі, наколькі гэта магчыма. Асабліва калі падумаць пра хуткасьці, перагрузкі і тэхналягічныя навінкі, якія суправаджаюць кожны касьмічны палёт».**

• ШТО ПІШУЦЬ •

## Пірацкая праблема

**Якую пазыцыю мусіць заняць Беларусь па іракцкай праблеме? Адмовіцца ад гучных заяваў, сядзець і не высоўвацца.** Ці прадаваў Лукашэнка зброю Хусэйну? Калі так, дык няма чаго да сябе прыцягваць увагу (каму вайна, а каму і матка родная). Калі не, дык тым больш ня варта зьвязвацца з самым пэрспэктыўным патэнцыйным нябожчыкам у сьвеце.

**А.Шрэк, Валожын**

## Што зрабілі за год

**«Стары годканчаем, новы зачынаем!» — так сьпяваецца ў беларускай калядцы. Для беларусаў пачатку Новага году заўсёды папярэднічае падвядзеньне вынікаў леташняга. Вось і мы падсумоўваем вынікі дзейнасьці Іркуцкага таварыства беларускай культуры за 2002 год.**

З студзеня 2002 г. газэта «Маланка», дзякуючы фінансавай падтрымцы Ўладзімера Якавенкі, стала выходзіць штомесяц у фармаце A4 на васьмі старонках (толькі за жнівень—верасень быў падвойны нумар), накладам 500 асобнікаў.

Сёлета афіцыйна, з правядзеньнем устаноўчых сходаў і выбарамі старшыняў, былі створаныя чатыры аддзяленьні ІТБК па вобласьці: у шахцёрскім горадзе Чарамхова (старшыня Васіль Ракіта), у Усьць-Ардынскай аўтаномнай бурацкай аркузе ў сяле Тургенеўка (старшыня Вольга Лойка), у горадзе Борацку (старшыня Руслан Георгіеў) і ў вёсцы Тарнопаль (старшыня Тацяна Дарчы). 21 сьнежня 2001 г. мы ўпершыню правялі Дзень беларускай культуры ў пасёлку Залары. І пабачыўшы, што выйшла прыгожае сьвята, пры настойлівым жаданьні Васіля Ракіты ў Чарамхове прайшоў з 21 сакавіка па 21 красавіка 2002 г. Месячнік беларускай культуры.

2 сакавіка адбыўся V зьезд ІТБК, на якім прысутнічалі 53 дэлегаты і 41 госьць. Быў нават старшыня Заканадаўчага сходу Іркуцкай вобласьці Віктар Бароўскі, які прывітаў зьезд, падкрэсьліў важнасьць унёску беларусаў у эканамічнае разьвіцьцё Прыбайкальля. На зьезьдзе была зацьверджана праграма разьвіцьця ІТБК на два гады і зацьверджаны гімн Таварыства «Магутны Божа».

У красавіку Іркуцк наведала каманда КВК БДУ. Мы ўдзячны маладзёнам за тое, што знайшлі час сустрэцца з актывам ІТБК у нашым офісе на вул.Чэхава, 2. 26 красавіка сябра Рады ІТБК Віктар Вадарацкі прысутнічаў на 5-гадовым юбілеі нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусь» у Рэспубліцы Комі, дзе ад імя прыбайкальскіх беларусаў прывеціў землякоў з паўночнага рэгіёну Расеі. 12 траўня году радзіна Натальлі Брызгун (з Гомельшчыны) сталася ляўрэатам конкурсу «Ганаровая сям’я» Іркуцку. 22—25 траўня фальклёрны ансамбль «Ленушка» браў удзел у Днях славянскай духоўнасьці і пісьменства ў горадзе Новасібірску. Нашых дзяўчат сустракалі там авацыямі. Але найбольш спадабаўся сумесны выступ «Ленушкі», цюменскага «Лянка», новасібірскіх «Азарычаў» і беларускага ансамблю «Сябры». А сам спадар Анатоль Ярмоленка пакінуў прыемнае ўражаньне ня толькі як артыст, але й як добры суразмоўца ды сапраўдны патрыёт. 31 траўня ў 6-ю гадавіну ўтварэньня ІТБК у Іркуцку адбылася літаратурная вечарына, прысьвечаная Янку Купалу і Якубу Коласу.

Усё лета па ініцыятыве ІТБК на асабістыя сродкі мэцэната У.Якавенкі ішло будаўніцтва беларускага музэйнага гісторыка-этнаграфічнага комплексу ў Тургенеўцы. Гэтая вёска заснавана беларускімі перасяленцамі яшчэ ў 1909 г. Людзі там вельмі актыўныя. Маюць дарослы беларускі хор «Варэнічкі» і дзіцячы фальклёрны ансамбль «Ручнічок». 18 кастрычніка адбылося ўрачыстае адкрыцьцё комплексу. Усё лета йшоў і збор інфармацыі ды экспанатаў для выставы «Беларусы Сібіры», якая адкрылася ў музэі гісторыі Іркуцку 7 кастрычніка. 2 кастрычніка два прадстаўнікі ІТБК бралі ўдзел у працы 2-га зьезду Фэдэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расеі». У лістападзе ў інфармацыйна-пазнавальнай праграме «Ад суседзкага Інфармбюро» 21 каналу Іркуцкага тэлебачаньня мы зладзілі месячнік беларускай кухні. Журналісты прыходзілі ў госьці да сяброў нашай суполкі, каб пакаштаваць беларускія стравы. А 15 сьнежня ў іркуцкай школе №31 адбыўся фэстываль «Як сустракаюць Новы год у розных краінах». Пятая «В» кляса, дзе шмат дзяцей беларусаў (у тым ліку і мой сын Алёша), паказала сцэнку «Беларускія Каляды». Дзеці гаварылі па-беларуску, але так выразна, што гледачам усё было зразумела.

Пачалася таксама рэалізацыя нашага новага праекту «Беларускія вячоркі», падтрыманага адміністрацыяй Іркуцкай вобласьці. Апроч таго, мы атрымалі два гранты на агульную суму 58 тыс. рублёў (3.500.000 беларускіх рублёў — **«НН»**) ад «Губэрнскага сходу грамадзкасьці». Гэта мэтавыя гранты на выкананьне нашых праграмаў: «Адраджэньне ткацкага майстэрства» і «Правядзеньне міжнацыянальных дыскатэк». Рэалізацыя гэтых праграм ужо пачалася.

**Алег Рудакоў, Іркуцк**

# Залатая жыла антыамэрыканізму




**Афіцыйны Менск паспрабуе скарыстаць раскол між заходнімі саюзьнікамі для сваёй далейшай легітымізацыі.**

Як у Беларусі мясцовыя выбары, дык Амэрыка абавязкова некага бомбіць бяз санкцыі ААН. Проста насланьнё! Мінулы раз — Косава, цяпер — Ірак. Тады справа скончылася аддзяленьнем Косава і арыштам Мілошавіча. Штосьці гэткае будзе і цяпер. Калі пачнецца. Бо ніколі яшчэ ЗША не сутыкаліся з такім зацятым супрацівам хаўрусьнікаў па NATO.

60-гадовы паўночнаатлянтычны маналіт раскалоўся. Французы ўспомнілі, што яны пацыфісты. Рамсфэльд даў жару старой Эўропе, неасьцярожна паставіўшы ёй у прыклад Эўропу «новую».

Амэрыканская прэса — зь ім. Калі б Амэрыкі не існавала, а Францыя заўжды паводзіла сябе так, як цяпер, дык сёньня эўрапейцы размаўлялі б па-расейску ці па-нямецку, іранізуе камэнтатар «Нью-Ёрк Таймз». А калі б сяброў Рады Бясьпекі выбіралі, як каманду зорак NBA, ён прагаласаваў бы не за Францыю, а за Індыю. Бо калі Індыі ўсё адно, што стане з Іракам, дык, у адрозьненьне ад Францыі, яна хоць гэтага не хавае.

Журналіст б'е па самым слабым месцы праціўнікаў вайны. Сапраўды, слаба верыцца ў ідэалізм немцаў ці пацыфізм французаў. У аналягічнай сытуацыі ў Косаве, калі з пункту гледжаньня міжнароднага права ўмяшаньне таксама выглядала сумнеўным, яны пераконвалі Клінтана не марудзіць. Эўропа баялася хвалі ўцекачоў з Косава.

Народы выступаюць супраць праліцця крыві шчыра. А большасьць палітыкаў — крывадушна. Насамрэч яны ня маюць нічога супраць працягу палітыкі іншымі сродкамі — вайсковымі ці паліцыйнымі. Выступаючы супраць вайны, яны проста выступаюць супраць Амэрыкі. Бо на антыамэрыканізьме, як і на любой зайздрасьці — напрыклад да багатых, — можна зарабляць палітычны капітал.

Падчас косаўскага крызысу было проста. Лукашэнкаўцы абапіраліся на Маскву і прадугадвалі яе пазыцыю. Нацыянальны рух, што атаясамлівае Беларусь з Захадам, падтрымліваў пазыцыю Захаду, нягледзячы на пачуцьцё славянскае і праваслаўнае салідарнасьці. А цяпер які з Захадаў падтрымаць?

Беларускія праціўнікі вайны і прыхільнікі ЗША грунтуюцца на адных маральных вартасьцях. Толькі высновы ў іх розьняцца.

Для адных вайна ў Іраку будзе проста вайной. Для другіх вайна ў Іраку будзе вайной супраць таталітарнай дыктатуры. І ў другім выпадку краіна, якая зьведала сталінізм і гітлерызм, ня можа не падтрымаць вайны з Садамам.

Існуе сотня прычынаў, каб давяраць у гэтай сытуацыі ЗША і інтуіцыі амэрыканскіх дыпляматаў. Тым больш што Штаты — сусед нашага суседа.

У выпадку перамогі ў Іраку Захад умацуецца. І Беларусь разам зь ім, як частка Захаду. Урэшце, да падтрымкі ЗША схіляе той факт, што на баку Амэрыкі выступілі ўсе краіны Цэнтральнае і Ўсходняе Эўропы, заціснутае між Нямеччынай і Расеяй, усе — ад Эстоніі да Славеніі. (Можна гаварыць пра поўнае фіяска нямецкае ўсходняе палітыкі.)

Беларуская дыпляматыя выбрала пазыцыю салідарнасьці з Іракам, выказаў яе асабіста кіраўнік дзяржавы. Толькі гэткая адкрытая салідарнасьць можа зашкодзіць дыпляматычнай актыўнасьці на эўрапейскім полі. Разумнае стаўленьне да змаганьня ЗША зь Нямеччынай і Расеяй за ўплыў на Ўсходнюю Эўропу магло б паспрыяць легітымізацыі цяперашняй улады. Але ўсё ж праціўнікаў ЗША ў Эўразьвязе меншасьць. Таму невядома, ці дасьць беларуская тактыка плён.

**Барыс Тумар**




# Вайна — гэта бяда

У нашым зьмененым сьвеце вайна, любая, — гэта бяда. Так і перадайце тэарэтыкам. Справядлівая ці несправядлівая, наступальная ці абарончая, нават антытэрарыстычная — бяда. Учора Югаславія, сёньня Ірак, заўтра… Заўтра цывілізаваны і дэмакратычны сьвет убачыць найярчэйшы свой антыпод у Паўночнай Карэі. Пасьлязаўтра — у Беларусі, дзе пануе апошні дыктатар Эўропы.

Рэжымы — як людзі. Ёсьць малыя, як дзеці; ёсьць не такія, як наш; ёсьць і зусім вар'яты, якіх цывілізаваныя супольнасьці называюць цяпер не вар'ятамі, а «іншымі»; ёсьць адкрыта варожыя. Але зь нядаўняга часу людзі перасталі забіваць наравістых і шкодлівых дзяцей, перасталі зьнішчаць вар'ятаў. У дачыненьнях зь імі зьявіўся іншы матыў — размаўляць. Хай бы немагчымым і безнадзейным гэта ні выглядала, трэба размаўляць. Якая б прорва ні была паміж намі — цывілізаванымі, адукаванымі і міралюбнымі — і імі — дзікімі, цёмнымі й ваяўнічымі, — мы мусім размаўляць. Са шкадлівым дзіцёнкам, з вар'ятам-«іншым», зь непрымірымым ворагам.

Кажуць, Амэрыка мае свае шкурныя інтарэсы ў гэтай вайне з Іракам. Маўляў, там, на далёкім полі бою, яна знойдзе сваю ўнутраную стабільнасьць, свой падноўлены імідж звышдзяржавы і бясконцыя запасы нафты. Але ня ў гэтым рэч. Трэба зусім ня ведаць Амэрыкі, каб падазраваць у ёй адно шкурніцтва. Сама Амэрыка кажа, што хоча захінуць сьвет ад пагрозы, якая сыходзіць з Іраку, ну і ў дадатак — зьнішчыць дыктатуру Садама, ашчасьлівіць іракці народ. Вось два матывы, якія нібыта апраўдваюць бяду.

Пачну з другога, бо ён бліжэйшы нам. Нас таксама можна захацець ашчасьлівіць, пазбавіўшы ад апошняга дыктатара Эўропы. Дыктатара гэтага выбірала большасьць нас і большасьць нас падтрымлівае дагэтуль — не таму, што ён такі ўжо нам любы, не, а таму, што яму пакуль што няма альтэрнатывы. Няма такой асобы, такой праграмы, такой энэргетыкі, такой хітрасьці, калі хочаце, якая б пераўзышла хітрасьць цяперашняга кіраўніка. Гэта значыць, што мы з вамі, усе разам, як народ яшчэ не гатовыя нарадзіць такога. Мы яшчэ толькі фармуемся як сучасная нацыя. Гэта адбываецца марудна і цяжка, але прысьпешыць гэта немагчыма. Ужо гадоў дзесяць амэрыканская дэмакратыя спрабуе дапамагчы нам дасьпець, аднак нічога з гэтага не выходзіць. Таму што немагчыма нікога загнаць палкамі ў рай. Трэба размаўляць. Бо нясьпеласьць нацыі ня можа быць падставаю для вайны.

Амэрыка мае досьвед размаўляньня — радыёстанцыі (успомнім, якую ролю ў развале імпэрыі СССР адыграла амэрыканскае радыё «Свабода»), тэлеканалы (для Кубы, а цяпер ствараюць і для арабскіх краінаў). Гэта ўсё — размаўляньне з-за мяжы. Ёсьць і «кантактны» спосаб — зварот да культураў у недэмакратычных краінах. Скажам, сёньня ў сьвеце зьявілася такое панямцье, як іранскае кіно, — і мы раптам пачулі іх, яшчэ ўчора зусім закрытых ад нас іранцаў. Культура, найперш яе мастацкія жанры, — заўсёды і першы дысыдэнт, і першы парлямэнтар, і першы міратворца. Бо зь яе сьвет даведваецца пра рэальны стан розуму ў краіне-ізгоі. Хіба не з раманаў Маркеса мы глядзелі на лацінаамэрыканскія дыктатуры, быццам зь сярэдзіны.

Найважнейшыя складнікі размаўляньня: пачуць і быць пачутым. Не сказаць і нават не паслухаць, а менавіта пачуць і быць пачутым. Бо пачуўшы, ты можаш адчуць, а адчуўшы — суперажываць, прымаць бяду іншага як сваю. Нічога большага і больш боскага за суперажываньне ў чалавеку няма. Гэта наша жыцьцё і ўсё, што ў нас ёсьць перад сусьветам, у якім мы яшчэ так мала ведаем і можам. Але ў выпадку з Іракам дамінуе пакуль што іншы матыў — сказаць. Сказаць, што наша цярпеньне вычарпанае і мы гатовыя пакараць ізгоя. Нягледзячы нават на тое, што статут ААН забараняе нам прэвэнтыўныя войны. Пры гэтым мы ня можам сказаць, што чуем Ірак і што Ірак чуе нас.

Другі матыў — пагроза, што зыходзіць ад Іраку для іншага сьвету. Але сучаснаму сьвету стакроць прасьцей забясьпечыцца ад такой пагрозы, чым стакроць большыя сродкі выдаткоўваць на бяду, якая стане агульнай для ўсіх.

Новая вайна ня дасьць такой сатысфакцыі, якую магла б даць яшчэ ня так даўна. Бо цяпер любая вайна, паўтаруся, — гэта бяда, а ў бяды ня можа быць перамогі. У сучаснай вайны ня можа быць пераможнага канца. Што ў вайны з талібамі ў Аўганістане, што ў антытэрарыстычнай вайны супраць бэн Ладэна, што ў расейскай вайны ў Чачэніі... Адно цяга гэтых войнаў множацца і множацца да бясконцасьці чалавечыя трагедыі. Гэта гібель непачутых і тых, хто ня даў сабе клопату пачуць. Пра гэтыя войны ўжо ня будзе такіх фільмаў, як пра другую сусьветную або нават карэйскую ці віетнамскую. Сьвет зьмяніўся. Мне цяжка ўявіць, каб бацькі амэрыканскага салдата, стоячы над ягонай труной, адгружаный з Іраку, адчувалі высокі гонар за свайго сына-героя. Калі вайна стала бядой, гэта значыць, што ў ёй не засталося месца анічому высокаму, сыцьвярджальнаму і сьветламу, як гэта было раней. Вайна стала татальным занудным холадам у сэрцы ўсіх яе ўдзельнікаў, бо ў бяды няма пераможцаў. Пераможцы могуць быць толькі над бядою, над вайною, над ідэяй бамбаваць нейкую краіну і нейкі народ толькі таму, што гэты народ выбірае дыктатара. Таму сапраўдным героем у сёньняшнім сьвеце стане той, хто прадухіліць бяду. Гэта значыць — здолее быць пачутым на тым баку лініі фронту і пачуе, што кажуць там.

**Сяргей Дубавец**

# «За» і «супраць» вайны з Іракам

Назіраючы за відовішчным выступам Коліна Паўэла перад Радай Бясьпекі ААН — з фрагмэнтамі тэлефонных размоваў, спутнікавымі здымкамі й выдатна скампанаванымі тэлеролікамі, — я запытаў сябе: «Што гэта зьменіць у маім стаўленьні да вайны ў Іраку?» І адказаў: «Няшмат». Мяне не пераконваюць аргумэнты «за», а «супраць» абуджаюць сумневы.

У справе Іраку я аддаю перавагу пазыцыі няўпэўненага, затурканага лібэрала (у англасаксонскім сэнсе гэтага слова, г.зн. чалавека левых поглядаў). Гэта ня значыць, што ты губляешся пад націскам цяжкіх пытаньняў. Я сам, маючы кожны раз прыстойную лібэральную матывацыю, энэргічна выступаў супраць савецкага нападу на Чэхаславакію й Аўганістан, а пасьля — супраць амэрыканскай інтэрвэнцыі ў Нікарагуа й Сальвадоры. Затое я быў прыхільнікам вайсковай апэрацыі ў Босьніі й Косаве, а таксама вайны супраць Аль-Каеды ў Аўганістане. Але Ірак — іншая, складанейшая справа. Я бачу тут па чатыры істотныя аргумэнты «за» і «супраць».



**Цімаці Гартан Эш (нар. 1955) — брытанскі гісторык, пісьменьнік і публіцыст, выкладае ў каледжы Сьв.Антонія, што ў Оксфардзе, і ў Інстытуце Гувэра Стэнфардзкага ўнівэрсытэту (ЗША). Аўтар кніжак «Польская рэвалюцыя. Салідарнасьць 1980—81», «У імя Эўропы. Немцы й падзелены кантынэнт», «Тэчка: асабістая гісторыя».**

## За:

1. Рэжым Садама Хусэйна — адзін з самых жахлівых у сёньняшнім сьвеце. На ім — кроў курдаў, ён — пастаянная пагроза для ўласнага грамадзтва. Зьнікненьне рэжыму было б блаславеньнем для краю й рэгіёну. Хаос, які надыдзе пасьля інтэрвэнцыі, ня будзе большым, чым быў у Босьніі, Косаве й Аўганістане.

2. Садам двойчы атакаваў суседнія краіны. Паводле словаў Коліна Паўэла, іракскі прэзыдэнт меў хімічнай і біялягічнай зброі пад завязку, а цяпер старанна хавае тое, што ад яе засталося. Апроч таго, ён намагаецца распрацаваць атамную бомбу. Калі б Садам займеў яе і мог выкарыстаць у любую хвіліну — гэта была б трагедыя для ўсяго сьвету. Большая, чым у выпадку з Паўночнай Карэяй. Трэба ж улічваць, хто такі Садам і ў якім рэгіёне сьвету ён дзейнічае.

3. За 12 гадоў Садам праігнараваў 16 рэзалюцыяў ААН. Ён зусім не зьбіраецца разьбройвацца або супрацоўнічаць з інспэктарамі ААН (ага, разьбяжыцца вам дыктатар супрацоўнічаць). Таму для вайсковае інтэрвэнцыі ў Ірак яшчэ больш падставаў, чым у выпадку Косава. Другая рэзалюцыя ААН была б «прыдатным абгрунтаваньнем справядлівай вайны».

4. Вынікі (аптымістычныя). Вайна магла б стацца каталізатарам дэмакратычных зьменаў на Блізкім Усходзе. Новы Ірак, што жыве ў дабрабыце й спакоі — «Іракская Заходняя Нямеччына», — зрабіўся б узорам для цэлага рэгіёну. Пасьля чарга дайшла б да Саудаўскай Арабіі й Ірану. Свабода пашыралася б па ўсім Блізкім Усходзе і ўрэшце дапамагла б вырашыць араба-ізраільскі канфлікт — як дэмакратызацыя Ўсходняй Эўропы выклікала аб'яднаньне Нямеччыны.

## Супраць:

1. Вайна заўсёды мусіць быць апошнім аргумэнтам. Якімі б чароўна дакладнымі не былі новыя амэрыканскія бомбы, гібель бязьвінных іракцаў непазьбежная. А хіба нельга стрымліваць Садама і далей з дапамогай цяперашняй палітыкі «спыненьня й застрашваньня»?

2. «Справядлівая вайна» патрабуе «прыстойных намераў». Я лічу намеры прэм'ера Блэра цалкам прыстойнымі, але ня маю такой упэўненасьці што да адміністрацыі прэзыдэнта Буша. Там розныя людзі з рознымі плянамі, а чалавечыя матывацыі звычайна заблытаныя. Я наўскідку склаў сьпіс магчымых матывацыяў. Такім чынам, амэрыканцамі кіруе:

— пачуцьцё, што іракская апэрацыя — частка «вайны з тэрарызмам», якая ад 11 верасьня стала зманьнем за бясьпеку Радзімы — Злучаных Штатаў — 20 %;

— перакананьне, што Садам з сваёй зброяй масавага зьнішчэньня зьяўляецца сур'ёзнай пагрозай для дэмакратычнага сьвету — 20 %;

— раздражнёнасьць тым, што немагчыма дастаць бэн Ладэна і «Аль-Каеду», і перакананьне, што для перамогі Садама вайсковай магутнасьці якраз-такі хопіць — 15 %;

— пачуцьцё, што расправа з Хусэйнам, пачатая падчас першай вайны ў Затоцы, яшчэ ня скончаная, і асабістая помста Джорджа Буша «пацану, які хацеў забіць майго тату» — 15 %;

— выгода, якую атрымае прэзыдэнт ва ўнутранай палітыцы (разьлічваў яе Карл Роўв, палітычны дарадца Буша; цяпер, магчыма, ён шкадуе) — 10 %;

— безвыходнасьць — назад шляху няма: як жа Буш выставіць сваю кандыдатуру на другі тэрмін, калі Садам застанецца пры ўладзе? — 10 %;

— надзея на карысныя для Ізраілю зьмены на Блізкім Усходзе — 5 %;

— нафта — 5 %.

Гэтыя працэнты можна паратасоўваць як заўгодна. Усё адно пераканаўчага камплекту лібэральных аргумэнтаў не атрымаецца.

3. Сувязь Садама з «Аль-Каедай» ня вельмі выяўная. І доказы Коліна Паўэла нічога новага не дадалі. Яны не абгрунтоўваюць тэзысу, што вайна з Іракам — гэта працяг змаганьня з «ісламскім фашызмам», распачатага 11 верасьня 2001 г. Усама бэн Ладэн лічыць рэжым Садама ератычным. І Садам, і «Аль-Каеда» — гэта зло, але зло рознае.

4. Вынікі (пэсымістычныя). Хоць ісламскія тэрарысты й ненавідзяць Садама, «амэрыканска-брытанская» вайна з Іракам павялічыць імавернасьць арабскіх тэрактаў у Эўропе й Амэрыцы. Вайна — не найлепшы спосаб дэмакратызаваць Блізкі Ўсход. Лепей было б падтрымаць аксамітную рэвалюцыю ў Іране й дэмакратычныя перамены ў Саудаўскай Арабіі, а таксама дапамагчы Шарону й Арафату набрацца розуму й дамовіцца. Дэмакратыя праз акупацыю — як у Нямеччыне й Японіі — гэта гістарычнае выключэньне. Мы ж атрымаем мадэль «іракцкай Югаславіі», разьдзёртай на розныя правінцыі. Амэрыка Буша ня ведае, як «будаваць дзяржавы». Прыклады — Босьнія, Косава й Аўганістан. Карацей, вынікі для рэгіёну будуць хутчэй дрэннымі.

Калі б нехта ўвёў Тоні Блэру сыроватку праўды, мы даzналіся б, што той падзяляе большасьць гэтых лібэральных сумневаў. Аднак у публічных выступах Блэр выказвае глыбокае, амаль місіянэрскае перакананьне, што інтэрвэнцыя неабходная. Чаму? Бо ён есьць тым, кім ёсьць, — хрысьціянскім лібэралам. А быць можа, ён робіць так, бо лічыць, што салідарнасьць Вялікай Брытаніі з ЗША і яе ўплыў на Штаты важнейшыя за магчымыя нэгатыўныя наступствы вайны з Іракам. А мо таму, што ён кіраўнік дзяржавы, а не пісьменьнік ці публіцыст. Ён мусіць вырашаць. Ён мусіць быць правадыром. Ён мусіць пераконваць скептыкаў і супрацьлеглую партыю.

Гэта ня значыць, што мы павінны рабіць тое самае. Мы ня мусім зводзіць складаную дылему да спрошчанага, эмацыйнага аднабаковага аргумэнту. Нават калі такое аднабаковае перакананьне лепш выглядае ў тэлеграме.

**Цімаці Гартан Эш,**
**Gazeta Wyborcza**

# Сьвет раскалоўся надвое

**NATO перажывае найбольшы крызыс за 30 гадоў. Францыя, Нямеччына, Бэльгія пярэчаць Злучаным Штатам.**



Падчас сустрэчы ў курортным мястэчку Лё Туке прэм'ер Вялікабрытаніі Тоні Блэр пераконваў прэзыдэнта Францыі Жака Шырака падтрымаць Злучаныя Штаты. Але Францыя разам зь Нямеччынай і Бэльгіяй усё ж заблякавалі ініцыятыву ЗША аб дапамозе Турцыі ў выпадку вайны з Іракам. Шырак настойвае, каб міжнародным інспэктарам па ўзбраеньнях далі больш часу, а калі спатрэбіцца — патроілі іхную колькасьць.

Францускі МЗС адпрэчвае чуткі пра сакрэтную француска-нямецкую антыамэрыканскую дамову. Тым ня менш, канцлер Нямеччыны катэгарычна выступае супраць вайсковай апэрацыі. «Нават калі ААН ухваліць атаку на Ірак, Нямеччына не падтрымае гэтага рашэньня. Яшчэ ня тая сытуацыя, каб мы нічога не маглі дамагчыся мірным шляхам», — зазначыў ён.

## Кітай устрымаецца

Кітай і Расея хоць і адмаўляюцца падтрымаць рэзалюцыю ААН, якая б дазволіла хуткую атаку на Ірак, але не стаяць у жорсткай апазыцыі да ЗША. У адрозьненьне ад іх эўрапейскіх «саюзьнікаў». Пасьля тэлефонных размоваў з Джорджам Бушам і Жакам Шыракам прэзыдэнт Кітаю Цзян Цзэмінь яшчэ раз пацьвердзіў, што краіна выступае за далейшыя інспэкцыі ААН у Іраку. «Мы павінны прымусіць усе бакі працягваць працу ў гэтым кірунку», — заявіў кітайскі лідэр. Аднак амэрыканскія аглядальнікі мяркуюць, што Цзян Цзэмінь ня будзе накладваць вэта, ён проста ўстрымаецца ў выпадку галасаваньня па рэзалюцыі ў Радзе Бясьпекі ААН. Ад добрых адносінаў з ЗША залежыць эканамічны рост Кітаю.

Прэзыдэнт Расеі Ўладзімер Пуцін «ня бачыць нагоды», каб цяпер пачынаць вайну ў Іраку. Ён так і сказаў пасьля сустрэчы з Гергардам Шродэрам у нядзелю. «Трэба настойліва працягваць працу па мірным разьбраеньні Іраку», — зазначыў Пуцін і дадаў, што «расейскія адмыслоўцы ўважліва вывучаюць матэрыялы, прадстаўленыя амэрыканцамі». Расея — самае слабое зьвяно ў эўрапейскай антыамэрыканскай кааліцыі.

## Усходняя Эўропа — «за»

Цэнтральна- й усходнеэўрапейскія краіны, наадварот, прыхільна ставяцца да ініцыятывы ЗША. Спачатку Польшча, Вугоршчына й Чэхія далучыліся да дэкларацыі, ініцыяванай Вялікабрытаніяй і Гішпаніяй, у якой ухваляецца курс Злучаных Штатаў адносна Іраку. Цэнтральнаэўрапейцы рызыкуюць згубіць падтрымку Бэрліна ў справе іхнага сяброўства ў ЭЗ. А праз некалькі гадзінаў пасьля дакладу Коліна Паўэла 10 дзяржаваў — кандыдатак у Эўразьвяз падпісалі новую супольную дэклярацыю, пазытыўна ацаніўшы пляны ЗША атакаваць Ірак. Адзін з дыпляматаў нават працытаваў міністра абароны ЗША Дональда Рамсфэлда, зазначыўшы, што «старой Эўропе» трэба навучыцца прымаць крытыку.

А вось Беларусь і Ўкраіна, наадварот, амаль адкрыта ўзялі бок Багдаду.

## Філіпіны дапамогуць

Адным з самых надзейных хаўрусьнікаў Вашынгтону ў Азіі лічацца Філіпіны. Прэзыдэнтка краіны Глёрыя Макапагал Ароя падчас вайны ў Аўганістане дазволіла выкарыстоўваць астравы ў якасьці перавалачнага пункту для вайсковых караблёў і самалётаў ЗША. А на тым тыдні Ароя заклікала ААН дзейнічаць хутка й рашуча, калі Ірак не пагодзіцца на разьбраеньне.

Філіпіны прымуць на час вайны тылавую базу амэрыканцаў.

Да плянаў ЗША ў цэлым прыхільна ставіцца таксама Індыя. Затое амэрыканцаў не падтрымлівае ніводная мусульманская краіна.

Сьвет затаіўся ў чаканьні дакладу, які зробяць 14 лютага, пасьля візыту ў Ірак, галоўны інспэктар ААН па ўзбраеньнях Ганс Блікс і старшыня МАГАТЭ Мухамэд аль-Барадэй.

**Ян Мацур**

# Садам быў харошы, пакуль меў грошы

## Стаўленьне арабаў да Хусэйна



REUTERS

Ірацкі лідэр заўжды меў прыхільнікаў сярод арабскае інтэлігенцыі, асабліва левае. Аднак гэта не бескарысьлівая падтрымка. Існуе так званая «купонная» сыстэма: за праіракскую прапаганду Хусэйн расплачваецца купонамі на атрыманьне пэўнай колькасьці нафты. Эгіпецкі пісьменьнік Мамдух аш-Шайх прапанаваў пракуратуры праверыць выпадкі подкупу палітыкаў, журналістаў і інтэлектуалаў рэжымам Садама.

Ён прыводзіць прыклады. Эгіпецкі пісьменьнік Гамаль аль-Гітані вітаў ірацкі напад на Іран і назваў іракцаў «вартаўнікамі ўсходняй сьцяны» агульнаарабскага дому. Пасьля ірацкага ўварваньня ў Кувэйт Гітані зьмяніў сваё меркаваньне. Але зноў не без карысьці для сябе. Ён узяўся кіраваць літаратурнай праграмай кувэйцкай князёўны Суад ас-Сабаг. Праграма мае шчодрае фінансаваньне.

Легендарны аўтар суфійскіх баек пра мудрых дэрвішаў Юсуф Ідрыс некалі атрымаў «Садамаўскую літаратурную прэмію». Іракцы спрабавалі выплаціць яе ў дынарах, але Ідрыс дамогся даляраў. Прэмію далі за апавесьць пра Садама — «змагара, мысьляра, чалавека».

Галоўны рэдактар рэспэктабэльнай каірскай газэты «Аль-Аграм» Ібрагім Нафі за інтэрвію з тыранам атрымаў «Мэрсэдэс». Пасьля праіракцкія артыкулы зьніклі з старонак эгіпецкіх газэтаў. Каірскія СМІ былі перакупленыя краінамі Пэрсыдзкае затокі, у прыватнасьці Кувэйтам, якія заплацілі болей, чым мог прапанаваць зьбяднелы Багдад.

Палестынскія інтэлектуалы больш пастаянныя ў сваёй прыхільнасьці да Садама. Так, вядомы палестынскі паэт Махмуд Дарвіш называў аднаго з бліжэйшых сяброў Хусэйна, міністра культуры Іраку Лятыфа Насіфа Ясіма «міністрам паэтаў». А прызнаныя ірацкія паэты аль-Гавагры, ан-Наваб і Садзі Юсуф тым часам жывуць у выгнаньні.

Палестынскі праваабаронца Джонатан Катаб з Усходняга Ерусаліму бачыць у Садаму заснавальніка новае «тэалёгіі вызваленьня». Ён не хацеў бы жыць у Іраку, але яму падабаецца рашэньне Хусэйна напісаць на сьцягу краіны «Алаг акбар». Гэта, мяркуе ён, праява веры ў Бога, мацнейшай за ўсе высокія тэхналёгіі.

Заступаецца за ірацкую дыктатуру і вядомы культуроляг Эдвард Саід. Калі Кянан Макія выдаў кніжку «Рэспубліка страху» пра тэрор у Іраку, Саід пасьпяшаўся з адпаведнай рэцэнзіяй: «Спытаем сябе, каму выгадны выступ гэтага чалавека. Хто за ім стаіць?»

На старонках «Аль-Аграм» і «Аль-Хаят» Саід дыскутуе зь лідэрамі ірацкай апазыцыі. Ён ня верыць у магчымасьць пабудовы дэмакратыі ў Іраку пасьля Садама і лічыць гэта фантасмагорыяй Макіі. Тэзы пра дэмакратыю, маўляў, «створаныя за пісьмовым сталом Макіі ў Дзяржэпартамэнце ЗША». Пры канцы Саід высоўвае супраць Макія забойчае для арабскага сьвету абвінавачаньне: маўляў, той езьдзіў у Ізраіль.

Саід называе амэрыканскую сыстэму і габрэйскае лобі ў ЗША драпежнымі. Ён лічыць, што адзіная мэта цяперашняй амэрыканскай палітыкі на Блізкім Усходзе — поўны выхад Іраку з палітычнай гульні. Таму, маўляў, ня варта зьвяртаць увагу на лютасьць і крыважэрнасьць уладароў кшталту Садама падчас іх «законнай барацьбы з ЗША». Маўляў, усім і так даўно ясна, што Садам за чалавек. І хопіць пра гэта.

Падобнае пазыцыі трымаецца й знаны сырыйскі паэт Адоніс, імя якога фігуруе ў сьпісах прэтэндэнтаў на Нобэлеўскую прэмію. Адоніс схільны бачыць палітыку ў чорнабелых колерах, прычым штатаўскую — выключна ў чорнай. У амэрыканскім мысьленьні, лічыць Адоніс, няма месца для правоў чалавека: «Гэта новая каляніялісцкая лёгіка, якая ня толькі ламае міжнародныя пагадненьні, але й пагарджае Чалавекам». Амэрыканская вайна, кажа Адоніс, — гэта ні што іншае, як новы спосаб абгрунтаваць галечу ў сьвеце.

Іншы сырыйскі паэт Нізар Габані, асабісты сябра Хусэйна і яго жонкі, пісаў, што ў Садамавых вачах — «прыгажосьць Іраку». Габані пару гадоў таму зрабіў скандал у Нямеччыне. Хацеў сказаць прыемнае немцам і прылюдна пахваліўся, што яго-ныя бацькі, пачуўшы пра фашысцкае ўварваньне ў Польшчу, з радасьці частавалі дзяцей на багдадзкіх вуліцах цукеркамі. А ірацкі паэт Абдул Вагаб аль-Баяці казаў, што Габані асабіста данёс на яго Садаму. У выніку Баяці мусіў уцякаць і ўрэшце памёр на чужыне — у Сырыі.

«Ніводзін арабскі інтэлектуал адкрыта на бок ЗША ня стане. Але й Садама Хусэйна нельга абараняць. Ён дэспат, крымінальнік і вар'ят. Я ня буду бедаваць, калі яго ня стане. Нават пацешуся, што гэтага чалавека нарэшце спасьцігла кара», — піша заснавальнік бэйруцкай газэты «Ас-Сафір» Абас Бэйдун. Ягоны голас, не падсалоджаны Садамавымі купонамі, можна лічыць аб'ектыўным меркаваньнем арабскае інтэлігенцыі пра ірацкі рэжым.

**СР**

# Агляд арабскага друку



AP

Арабскі сьвет не сумняецца ў непазьбежнасьці вайны ЗША з Іракам і гадае толькі, калі яна пачнецца. З прычыны адсутнасьці палітычнае думкі ў арабскіх краінах (у такім выглядзе, у якім яе разумеем мы, заходнія людзі) арабскі друк абмяжоўваецца антываеннай і антыамэрыканскай публіцыстыкай.

Выдавец левацэнтрысцкай бэйруцкай «Ас-Сафір» Абас Бэйдун піша: «Я апошні стану на бок Садама. Але й ЗША ня маюць права «вучыць» Ірак. Хіба не яны колісь падтрымлівалі гэты вар'яцкі рэжым? Хіба ім была справа да ягонае дэмакратычнасьці? Чаму ж цяпер Штаты вырашылі адабраць у Садама біялягічную зброю, якую самі дапамаглі стварыць? Такія пытаньні задаем мы, і антызаходніцтва тут ні пры чым».

Суданскі тыднёвік «Ад-Даравіш» піша пра нелягічнасьць амэрыканскіх заяваў. «Чаму, кажучы пра небясьпеку ірацкае зброі масавага зьнішчэньня, Вашынгтон маўчыць пра атамную праграму Ізраілю, якога не назавеш мірнай дзяржавай? Буш мала цяміць у сытуацыі на Блізкім Усходзе, калі называе ізраільскага прэм'ера Шарона «чалавекам міру». Чаго яшчэ можна чакаць ад цемрашала?» — скrandчае свой рэдакцыйны камэнтар «Ад-Даравіш».

Газэта «Аль-Хіляль», што выдаецца ў Лёндане (як і мноства іншых арабскіх СМІ; робіцца гэта дзеля захаваньня незалежнасьці ад уладаў і бясьпекі журналістаў), піша: саспалітыя арабы ня вераць амэрыканскім заявам, нібыта мэта вайны — зрынуць тырана й дэмакратызаваць Ірак. Усе памятаюць 1980-я, калі Хусэйн ваяваў з рэвалюцыйным Іранам. Вашынгтон тады не шкадаваў для Садама нічога. І «не заўважаў», як Хусэйн выкарыстоўвае супраць курдаў ды іранцаў атрутныя газы. Урэшце, аўтакратычныя рэжымы існуюць у шмат якіх арабскіх краінах, і ў ЗША зь імі цудоўныя стасункі.

Уварваньне ў Ірак створыць небясьпечную сытуацыю для бальшыні арабскіх рэжымаў. Палітычна, гаспадарча і вайскова яны залежныя ад ЗША, піша рэспэктабэльная лёнданская ж «Аль-Хаят».

Палохае арабскіх дыктатараў і пытаньне, хто будзе наступным пасьля Іраку. Таму нават самыя верныя арабскія хаўрусьнікі Вашынгтону не сьпяшаюцца яго адкрыта падтрымліваць. Адначасова яны ўсьведамляюць, што ня змогуць адмовіць амэрыканцам. Гэтым разам, у адрозьненьне ад 1991 г., ЗША ня хочуць дапамогі арабскіх войскаў. Амэрыканцам трэба базы і палітычная падтрымка. Яшчэ яны чакаюць, што мясцовыя спэцслужбы здолеюць прадухіліць тэракты супраць амэрыканцаў.

Арабскія ўлады пазьбягаюць адкрыта сустракацца з эмісарамі Садама і манэўруюць. Яны папярэджваюць Захад пра «катастрафічныя» наступствы вайны (праўда, не ўдакладняючы якія), прапануюць Хусэйну цясьней супрацоўнічаць з інспэктарамі, цішком спрабуюць схіліць тырана да ад'езду ў выгнаньне. Пэрспэктыва ўсталяваньня ў Іраку празаходняга дэмакратычнага рэжыму, а ў пэрспэктыве — выхаду NATO да Пэрсідзкае затокі выклікае начныя кашмары ў шэйхаў і прэзыдэнтаў, што прывыклі да безальтэрнатыўнага кіраваньня.

**СР**

## Падгайны — за роўны аб’ём

**Міністар інфармацыі Міхаіл Падгайны заявіў у сераду, што аб’ём вяшчаньня расейскіх тэлеканалаў у Беларусі і беларускіх у Расеі мусіць быць роўным.** Гаворачы пра рашэньне беларускіх уладаў скараціць расейскае вяшчаньне, міністар патлумачыў, што гэта — агульная тэндэнцыя ў СНД.

## Сьвёнтака прыняў Папа

**10 лютага Ян Павал II прыняў у Ватыкане сямёх беларускіх біскупаў з кардыналам Казімірам Сьвёнтакам на чале.** Такія сустрэчы адбываюцца раз на пяць гадоў. Папа заклікаў біскупаў надаваць больш увагі працы з гарадзкім насельніцтвам, працягваць экумэнічны дыялёг з праваслаўнай Царквой. Галоўны друкаваны орган Ватыкану — газэта «Osservatore Romano» надрукавала тэкст поўнага выступу Папы па-беларуску.

## І Эўропа сытая, і Лукашэнка цэлы

**10 лютага пачаў працу новы кіраўнік офісу АБСЭ нямецкі дыплямат Эбэргарт Гайкен.** Як і Вік, ён знаходзіцца ў Беларусі безь сям’і. Амбасадар Гайкен будзе мець меншыя паўнамоцтвы, чым ягоны папярэднік.

## Пераклалі Туркменбашы

**Кніга прэзыдэнта Туркменіі Сапармурата Ніязава «Рухнама» выйшла па-беларуску.** Пераклалі яе Леанід Драньков-Майсюк, Анатоль Кудравец, Анатоль Бутэвіч і Мікалай Сільчанка. У Туркменіі, трэба адзначыць, пры ўладкаваньні на працу, паступленьні ў ВНУ здаюць экзамен на веданьне «Рухнамы». Грамадзянам Туркменіі рэкамэндуецца таксама штодзень да канца жыцьця завучваць па старонцы зь яе на памяць.

## Помнік Міцкевічу

**Саўмін пастанавіў усталяваць у Менску бронзавы памятнік Адаму Міцкевічу.** Да красавіка ён мусіць быць адліты.

## Рэканструкцыя вымагае «затораў»

**Ад 10 да 28 лютага будуць закрытыя тры з шасьці палосаў менскага праспэкту Дзяржынскага** (ад вул.Ясеніна да МКАД). Зьвязана гэта з рэканструкцыяй.

## Сьмяротная канвэрсія

**8 лютага ў цэху №18 гомельскага заводу «Цэнтраліт» ад выбуху снарада загінуў 32-гадовы газарэзчык.** Яшчэ двух работнікаў моцна скалечыла. Яны перапрацоўвалі вайсковыя боезапасы. У выніку халатнасьці падчас сартаваньня ім у рукі трапіў баявы снарад. Калі газарэзчык узяўся распалавіньваць яго, адбыўся выбух. Запасаў сьмерці ад савецкага войска засталося столькі, што працы «Цэнтраліту» будзе на доўгія гады.

## У асабліва буйных памерах

**10 лютага былі ўзбуджаныя дзьве крымінальныя справы супраць службовых асобаў.** Першы падсьледны — дырэктар Берасьцейскай фабрыкі сувэніраў Васіль Стасюк. Другі — начальнік складу паліўна-лякаматыўнага дэпо Баранавіч Вячаслаў Літавор.

# Курбан–Байрам


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Падчас набажэнства ў Навагрудзкім мячэце. У цэнтры — імам Алі Шагідзевіч.**

## Беларусь на Эўрабачаньні

**У Эўрабачаньні-2004 возьме ўдзел беларускі выканаўца.** Песьню на конкурс будзе выбіраць журы з чатырох музыкаў і чатырох грамадзкіх дзеячоў ды тэлегледачы. Канцэрт фіналістаў можна будзе пабачыць у тэлепраграме Першага каналу «На скрыжаваньнях Эўропы».

## Афон: першая ахвяра

**На сьвятой гары Афон ёсьць ахвяра канфлікту паміж манахамі й Канстантынопальскім патрыярхам.** У панядзелак 25-гадовы манах Трыфан зваліўся зь берагавога абрыву, калі ўначы спрабаваў уцячы на трактары з паліцэйскай аблогі. Праваслаўны Эсьфігмэнаў манастыр адрэзаны ад сьвету з 29 студзеня. Як пісала «НН» (№5), 117 манахаў мусілі, згодна з загадам Канстантынопальскага патрыярха, пакінуць манастыр, бо лічаць збліжэньне патрыярхату з каталіцкім касьцёлам ератычным. Мэтод, ігумен манастыру, сьцьвярджае, што запасаў вады і ежы там хопіць на два гады.

Паліцыя разамкне блякаду, каб дазволіць родным Трыфана ўзяць удзел у пахаваньні.

## Гарадня выходзіць да Балтыкі

**6 лютага ў Гданьску, дзе месьціцца сакратарыят Саюзу Балтыйскіх гарадоў, пабыў каардынатар Рады ўстойлівага разьвіцьця Гарадзенскай вобласьці Франц Аўдзей.** Гарадня будзе ў Саюзе назіральнікам, бо ня мае непасрэднага выхаду да мора. Мо гэта часова?

**Паводле радыё «Свабода», БелаПАН, Gazeta Wyborcza; Антон Лабовіч, Гародня**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Нафтахімія на продаж

**Міністэрства эканомікі патлумачыла, як будуць прадаваць акцыі беларускай нафтахіміі.** З малатка пойдзе 43,27% статутнага фонду «Нафтану» (пачатковая цана 476 млн. даляраў), 43,19% (311 млн.) — «Паліміру», 43,08% (293 млн.) — «Азоту», 43,66% (71 млн.) — «Хімвалакна». На продаж будуць штогод выстаўляць па 10% акцыяў. Уладальнік «пакецікаў» будзе мець права набыць наступны толькі пасьля таго, як расшчодрыцца на немалыя інвэстыцыі. Сёлета патэнцыйны пакупнік мусіць укласьці ў «Нафтан» 59,8 млн. даляраў, у «Палімір» — 23 млн., у «Азот» — 24,1 млн., у «Хімвалакно» — 6,6 млн. Першы аўкцыён адбудзецца ў сакавіку-красавіку. Умовы дужа нявыгадныя, таму верагодны «слаўнафтаўскі» варыянт: байкот аўкцыёну з мэтай зьбіць пачатковы кошт.

## «Белтрансгаз» акцыянуюць

**Да 1 красавіка «Белтрансгаз» ператорваць у акцыянэрнае таварыства.** Урад ацаніў яго асноўныя фонды ў 600 млрд. рублёў, газаразьмеркавальныя станцыі — у 29 млрд., падземныя газасховішчы — у 56 млрд. Акцыянаваньня дамогся «Газпром», перакрыўшы летась Беларусі газавы вэнтыль. Пакуль «Белтрансгаз» застаецца рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам, «Газпром» ня мог яго набыць.

## «Менск» чатырохтактавы

**Менскае ААТ «Мотавэля» выпусьціла першую партыю матацыклаў з чатырохтактавым рухавіком і электрастартэрам.** Яго магутнасьць — 10 к.с., аб’ём — 125 куб. см. На 100 км ён «зьядае» 3,5 літра бэнзыну (АІ-92 ці АІ-93). Максымальная хуткасьць такога «жалезнага каня» — 85 км/г. Рухавікі для першай партыі закупленыя ў Кітаі, але з часам завод пачне рабіць свае.

Новыя матацыклы прасьцей будзе прадаваць за мяжу, бо двухтактавыя рухавікі, якія стаяць на ранейшай прадукцыі «Мотавэля», забароненыя ў многіх краінах Эўропы. Экспартаваць плянуецца палову новых матацыклаў. Другую будуць прадаваць тут. Завадзкая цана кожнага — 450 даляраў.

## Выручку — у абменьнік

**Цяпер, каб набыць валюту ў абменным пункце, можна будзе замест пашпарту паказваць любы дакумэнт,** які ўтрымлівае пашпартныя зьвесткі — хоць даведку з органаў унутраных справаў. А яшчэ «абменьнікі»ператворацца ў стацыянарных інкасатараў: Нацбанк дазволіў ім прымаць выручку прадпрымальнікаў у рублях.

## Мабільнай вайны ня будзе

**Зьяўленьне новага стандарту сотавай сувязі cdma2000 ад «БелСел» суправаджаецца скандалам.** 5 лютага першы беларускі мабільны апэратар «МЦС» («Velcom») заблякаваў званкі на свае тэлефоны з апаратаў, падлучаных да «БелСелу». 12 лютага апэратары дамовіліся. «МЦС» паведаміла пра тарыфы на новую паслугу. Хвіліна размовы з гаспадаром «белселаўскага» мабільніка на тарыфных плянах «Velcom Стандарт» і «Velcom Бізнэс+» будзе каштаваць адпаведна: у працоўны час — 340 і 255 руб., уначы — 195 і 145 руб., у іншы час — 305 і 230 руб.

## Нацбанк прадае акцыі

**Нацбанк прадасьць з аўкцыёну акцыі камэрцыйных банкаў «Пошук», «Белзьнешэканамбанк», «Міжгандальбанк».** Банкі губляюць асноўнага акцыянэра. Нацбанк трымаў 91,5% акцыяў «Пошуку», 27,3% — «Белзьнешэканамбанку» ды 41,03% — «Міжгандальбанку». Паводле Канцэпцыі разьвіцьця банкаўскай сыстэмы на 2001—2010 г., дзяржава паступова выводзіцца зь ліку акцыянэраў асобных камэрцыйных банкаў.

**АК**

• НАВІНКІ •

# ARCHE




На пачатку лютага выйшаў з друку першы сёлетні нумар «ARCHE». У ім дамінуюць матэрыялы, тэматычна прысьвечаныя Расеі. Іван Антановіч, Пётар Вайль, Ганс-Георг Вік, Гелена Дэмакава, Валерыя Навадворская, Уладзімер Някляеў, Зянон Пазьняк і Зэлімхан Яндарбіеў разважаюць над тым, ці застаецца Расея імпэрыяй і ці чакае яе немінучы распад. Гісторык Мікалай Паўловіч крытычна разглядае расейскія школьныя падручнікі гісторыі апошняга дзесяцігодзьдзя. Ален Бэзансон асэнсоўвае культурныя падваліны расейскай цывілізацыі, культуроляг Максім Шчур задумваецца над прыродай вялікарускага фашызму, русіст Жорж Ніва тлумачыць, чаму ўва Францыі традыцыйна моцныя антырасейскія настроі. Завяршае падборку тэкстаў пра Расею бліскучы аналіз расейскага імпэрскага дыскурсу, зроблены ўкраінскім філёзафам Міколам Рабчуком.

Таксама ў гэтым нумары Наталя Якавенка рэцэнзуе манаграфію Генадзя Сагановіча «Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасьці да канца XVIII ст.», Аляксей Бацюкоў выяўляе постмадэрнісцкія тэндэнцыі ў сучасным беларускім творстве. Аматараў літаратуры чакае сустрэча з новымі творамі Наталкі Бабінай, Віталя Стахіевіча, Усевалада Гарачкі й Леаніда Маракова.

Набыць «ARCHE» можна ў кіёсках «Белсаюздруку», кнігарнях аб’яднаньня «Белкніга» і ў незалежных распаўсюднікаў.




# Дзеяслоў

Незалежны часопіс літаратуры, мастацтваў і публіцыстыкі.

У №2: Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Галубовіч, Ларыса Геніюш, Васіль Зуёнак, Вінцэсь Мудроў, Сяржук Сокалаў-Воюш, Уладзімер Сцяпан ды іншыя.

Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў.

Адрас рэдакцыі: 220089, Менск-89, а/с 73. E-mail: dzieja@tut.by

• МЭДЫ •

# Мінскія часы

**На другім дзесяцігодзьдзі свайго існаваньня дзяржава Беларусь разжываецца ўсё новымі атрыбуцыкамі незалежнасьці. Вось беларускі выканаўца паедзе на конкурс «Эўрабачаньня». А вось каляровы тыднёвік для раздачы замежнікам. Называецца «The Minsk Times».**




Ён выдаецца пры «Беларуси сегодня». На крэйдаваной паперы, вытворчасьці няма не цэлюлёзна-папяровага ведамства, якое патранує генэрал Глухоўскі. Друкуецца ў Доме Друку, які, аказваецца, здольны даваць якасьць, ня горшую за фінскія друкарні.

Разабраўшыся з апазыцыяй унутранай, лукашэнкаўцы ўсур’ёз узяліся за апазыцыю замежную. Газэта прызначаная для бясплатнага распаўсюду ў самалётах, што лятуць у Беларусь, і афіцыйных прадстаўніцтвах краіны. Наклад першага нумару — 2000 ас.

Наяўнай англамоўнай газэце «Belarus Today», якая належыць да апазыцыйнага сэгмэнту СМІ, пасьля зьяўленьня «Minsk Times» прыйдзецца пацясьніцца. Дагэтуль у сваёй нішы яна была манапалісткай. А цяпер рэкляму рэстаранаў і лазьняў, заўсёдніцу такога кшталту выданьняў, прыйдзецца дзяліць з канкурэнтамі.

Пакуль жа зьмесціва «The Minsk Times» саступае друку па якасьці. Кідаецца ў вочы, што перакладчыкі (мо таксама выпісаныя зь Фінляндыі ці Расеі?) усё перакладаюць на ангельскую з расейскай. Абсалютна ўсё. Нават назву балету «Жызэль». У іх гэта гучыць Jizel. І беларускія імёны ўласныя, напрыклад Golshany. А гэта ж нібы назваць газэту «Мінскія часы». Фармальна ўсё законна, слоўнікам Мюлера і Крапівы адпавядае. Але памылкова. Пісьменна было б захоўваць іншамоўныя імёны ўласныя ў правапісе арыгіналу, а беларускія транскрыбаваць зь беларускай мовы.

**Мікола Бугай**

**10 самых папулярных марак**

| Марка | Адносна леташніх паказьнікаў |
|---|---|
| 1. «Фальксваген» | +18.059 |
| 2. «Аўдзі» | +12.300 |
| 3. «Форд» | +10.846 |
| 4. «Масквіч», «ІЖ» | +5266 |
| 5. «Опэль» | + 4405 |
| 6. «Рэно» | +4202 |
| 7. «Пэжо» | +3276 |
| 8. «ЗАЗ» | +2475 |
| 9. «Сэат» | +1982 |
| 10. «Мазда» | +1869 |

# Кожны соты — на «мэрсэдэсе»

## Але самай папулярнай машынай застаецца «фальксваген»



IREX-PROMEDIA

### 25 самых пашыраных марак аўтамабіляў

| Маркі аўтамабіляў | Стаіць на ўліку ў Беларусі | | Па абласьцях і ў Менску (на 1 студзеня 2003 г.) | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | на 01.01. 2002 г. | на 01.01. 2003 г. | Гарадзенская | Віцебская | Магілёўская | Гомельская | Менская | Берасьцейская | Менск |
| «ВАЗ» | 425.699 | **423.938** | 45.629 | 64.814 | 46.705 | 73.466 | 67.529 | 49.363 | 68.426 |
| «Масквіч», «ІЖ» | 200.407 | **205.019** | 31.991 | 34.138 | 21.148 | 30.344 | 32.656 | 24.430 | 30.322 |
| «Фальксваген» | 151.450 | **169.509** | 27.388 | 16.249 | 13.876 | 22.157 | 19.363 | 31.613 | 38.863 |
| «Аўдзі» | 101.686 | **113.986** | 20.260 | 11.207 | 8185 | 12.138 | 13.722 | 24.404 | 24.070 |
| «ЗАЗ» | 113.565 | **116.040** | 13.854 | 18.966 | 15.433 | 18.880 | 17.514 | 13.957 | 17.436 |
| «Форд» | 82.038 | **92.884** | 13.927 | 8938 | 8773 | 9339 | 14.073 | 14.981 | 22.853 |
| «Опэль» | 84.359 | **88.764** | 12.151 | 10.893 | 7747 | 9527 | 12.832 | 13.731 | 21.883 |
| «Мэрсэдэс-Бэнц» | 46.197 | **38.089** | 5376 | 3194 | 4354 | 5227 | 6475 | 1105 | 12.358 |
| «Мазда» | 28.490 | **30.359** | 3855 | 2535 | 2469 | 3283 | 3998 | 3991 | 10.228 |
| «БМВ» | 27.710 | **29.358** | 3354 | 2453 | 2107 | 2607 | 4322 | 4144 | 10.371 |
| «ГАЗ» | 25.946 | **26.451** | 2490 | 3512 | 2954 | 3917 | 3658 | 2235 | 6685 |
| «Рэно» | 14.364 | **18.566** | 2570 | 1603 | 1410 | 1917 | 2591 | 2753 | 6722 |
| «Фіят» | 12.630 | **14.024** | 2156 | 1220 | 1385 | 1416 | 2107 | 1994 | 3746 |
| «Пэжо» | 9418 | **12.694** | 1531 | 864 | 843 | 1213 | 1528 | 1520 | 5199 |
| «Нісан» («Датсун») | 13.198 | **10.962** | 2149 | 848 | 1519 | 2184 | 1817 | 2445 | 4837 |
| «Міцубісі» | 9640 | **10.483** | 1393 | 1030 | 821 | 945 | 1279 | 1574 | 3441 |
| «Вольва» | 9580 | **10.197** | 1046 | 940 | 871 | 1020 | 1440 | 1768 | 3112 |
| «Таёта» | 9040 | **9553** | 804 | 1001 | 650 | 1226 | 1120 | 1299 | 3453 |
| «УАЗ» | 7829 | **7292** | 799 | 1839 | 1138 | 1305 | 1367 | 551 | 493 |
| «ЛуАЗ» | 6360 | **6371** | 738 | 1095 | 1032 | 1311 | 928 | 906 | 361 |
| «Сэат» | 3548 | **5530** | 968 | 361 | 461 | 553 | 711 | 939 | 1537 |
| «Хонда» | 4235 | **5417** | 517 | 510 | 450 | 413 | 479 | 557 | 2491 |
| «Шкода» | 3799 | **4209** | 357 | 282 | 177 | 402 | 489 | 357 | 2145 |
| «Сітраён» | 2479 | **3147** | 416 | 244 | 242 | 255 | 418 | 416 | 1156 |
| «Вартбург» | 3047 | **2925** | 106 | 415 | 73 | 270 | 344 | 191 | 1526 |
| Разам легкавікоў у краіне | 1.432.227 | **1.507.295** | 199.340 | 199.519 | 146.954 | 209.550 | 218.089 | 218.035 | 315.808 |
| У % ад агульнай колькасьці легкавікоў, зарэгістраваных сёлета | 95% | **100%** | 13,2% | 13,2% | 9,7% | 13,9% | 14,5% | 14,5% | 21% |
| У тым ліку легкавікі з «правым рулём» | 295 | **218** | 25 | 104 | 17 | 22 | 30 | 20 | - |
| Колькасьць жыхароў | **9,96 млн.** | | 1,17 млн. | 1,36 млн. | 1,2 млн. | 1,53 млн. | 1,55 млн. | 1,47 млн. | 1,68 млн. |
| Колькасьць легкавікоў на 1 тысячу чалавек | 144 | **151** | 170 | 147 | 122 | 137 | 141 | 148 | 188 |

**Працяг са старонкі 1.**

Вялікая колькасьць машынаў расейскай вытворчасьці ў Беларусі ня сьведчыць пра іх папулярнасьць. Гэта проста «спадчына» савецкіх часоў. Найбольш яе засталося ва ўсходніх рэгіёнах. Гэтак, у Гомельскай ды Віцебскай абласьцях на тысячу чалавек прыпадае 48 «жыгулёў» ды «ладаў» (у Гарадзенскай — 39, Берасьцейскай — 34). Гэтым Беларусь адрозьніваецца ад Расеі, дзе дагэтуль 83% легкавікоў — расейскія.

Цяпер беларусы ў асноўным прыцэньваюцца да заходнеэўрапейскіх аўто, бо амэрыканскія і японскія даражэйшыя. Найбольшай папулярнасьцю карыстаюцца нямецкія машыны. Немалую ролю тут грае кошт на запчасткі (француския ды італьянскія каштуюць болей, чым нямецкія).

Калі ў Менску ўсе маркі нямецкіх аўтамабіляў прадстаўленыя даволі шырока, дык па-за сталіцай багата хіба недарагіх «фальксвагенаў» ды «аўдзі». Паглядзім па марках: найлепш забясьпечаны «фальксвагенамі» Менск — 23 аўтамабілі на тысячу чалавек, найгорш — Магілёўшчына — 12 на тысячу. Сытуацыя з «аўдзі» ня дужа адрозьніваецца: Менск — 14 на тысячу, Магілёўская вобласьць — 7 на тысячу. З дарагімі маркамі ўсё інакш: Менск мае 6 «БМВ» на тысячу жыхароў, а Магілёўская вобласьць — толькі 1,8. Найменш «мэрсэдэсаў» у жыхароў Берасьцейшчыны (0,8 на тысячу чалавек), у менчукоў — 7,4 на тысячу. Калі сталіца забясьпечаная «фальксвагенамі» ды «аўдзі» лепш за правінцыю ў 2 разы, дык «БМВ» — у 3, а «мэрсэдэсамі» — у 7 разоў.

Здараюцца й невытлумачальныя кур'ёзы: на Гомельшчыне сканцэнтраваныя амаль усе амэрыканскія «олдсмабілі» (142 з 176), тады як у іншых абласьцях іх ад сілы па штук пяць, нават у Менску толькі 23. Машыны нерасейскай вытворчасьці, якіх у сталіцы значна менш, чым у правінцыі, — гэта ўкраінскія «Запарожцы» ды «Таўрыі».

Выношваючы пляны стварэньня «народнага легкавіка», Гітлер наўрад ці думаў, што той зробіцца народным у Belarusland. Тым ня менш, сёньня «фальксваген» — самы запатрабаваны аўтамабіль у Беларусі, асабліва — у сталіцы, дзе займае другое па колькасьці месца пасьля «жыгулёў». Праўда, калі ў 2001 г. «фальксвагенаў» у нас паболела на 22937 аўто, дык у 2002 г. прыток зьменшыўся да 18059.

У жніўні 2001 г. Аляксей Ваганаў, кіраўнік расейскай кампаніі «Лада-ОМС», вёў перамовы з кіраўніцтвам канцэрну «Фальксваген», спадзеючыся наладзіць у Беларусі на былым заводзе «Форд-Юніён» у Абчаку зборку «шкодаў» (гэтая чэская фірма належыць нямецкаму канцэрну). Плянавалі зьбіраць дзьве мадэлі «шкодаў» — «Фабія» ды «Актавія», цана на якія мусіла скласьці 6—7 тысячаў даляраў.

Гэтая, трэцяя па ліку, спроба наладзіць выраб «шкодаў» у Беларусі (першую зрабіла фірма «Пушэ», другую — нямецка-беларуская фірма «Бел-Фэр») таксама была няўдалай. Чацьвёртую намагаўся зьдзейсьніць сам Лукашэнка летась у лістападзе падчас саміту НАТО ў Празе, аднак яго не пусьцілі ня толькі на завод «Шкоды», але і ў саму Прагу.

Калі параўнаць, на колькі павялічылася колькасьць аўтамабіляў тае ці іншае маркі ў параўнаньні зь мінулым годам, выйдзе, што найбольш энэргічна на наш рынак прасоўваецца «Сэат». Прырост аўто гэтай маркі склаў 55,9%. За ім ідуць «Рэно» (29,3%), «Форд» (13,2%) ды «Аўдзі» (12,1%). «Фальксваген» са сваімі 11,9% толькі на 5-м месцы. А ўжо за ім — «Фіят» — 11%, «Мазда» — 6,6%, «БМВ» — 5,9%, «Масквіч» — 2,6% ды «Запарожцы» з «Таўрыямі» — 2,2%.

Колькасьць зарэгістраваных «мэрсэдэсаў» летась зьменшылася на 8108 (17,6% свайго «парку» ў Беларусі). Гэтыя дарагія аўтамабілі масава вывозяцца ў Расею, якая пачынае забывацца пра дэфолт. Дагэтуль на «мэрсэдэсе» езьдзіць кожная сотая беларуская сям'я. Амаль усе аўтамабілі амэрыканскіх марак («шэўрале», «додж», «олдсмабіль», «плімут», «кадылак», «мэрк'юры», «пантыяк») таксама згубілі ў колькасьці. Але іх і раней было няшмат.

Самая рэдкая машына ў краіне — італьянская «іначэнці». Іх больш не выпускаюць, бо гэтую фірму «праглынуў» «Фіят». У 2001 г. у Беларусі было 7 аўто гэтай маркі, на 1 студзеня засталіся толькі 2: адна — у Магілёўскай вобласьці, другая — у Берасьцейскай.

**Алесь Кудрыцкі**

**У часе падрыхтоўкі выкарыстаная статыстыка «Аўтабізнэс—Weekly».**

### Суадносіны легкавікоў расейскай і нерасейскай вытворчасьці

(аўтамабілі бязь зьвестак пра вытворцу ня ўлічваліся)

| Легкавікі | Стаіць на ўліку ў Беларусі на 01.01.2002 г. | на 01.01.2003 г. |
|---|---|---|
| Легкавікі расейскай вытворчасьці | 658.061 (47%) | 661.065 (45%) |
| Легкавікі нерасейскай вытворчасьці | 742.304 (53%) | 800.556 (55%) |

## Прыватныя грузавікі, аўтобусы

Паволі расьце колькасьць грузавікоў у прыватным карыстаньні. На 1 студзеня іх было 58463 (гэтая колькасьць вырасла на 3,7%, тэмпы росту паскорыліся ў параўнаньні зь мінулым годам). Гаспадары — у асноўным прадпрымальнікі. А вось «недзяржаўных» аўтобусаў у Беларусі паменела на 2400. Цяпер іх 10235 супраць 31024 аўтобусаў, што належаць прадпрыемствам ды ўстановам.

Па чым дзяржава ніколі не дагоніць нашых аўтааматараў, дык гэта па колькасьці матацыклаў і матаролераў, якіх у прыватным карыстаньні ў 44 разы больш (514191 проці дзяржаўных 11674).

# 14 лютага пятніца

## БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 20.35, 21.55, 23.00 Навіны.
6.15, 7.15 Добрай раніцы, Беларусь!
8.15, 18.20 «Клеапатра». Сэрыял (Англія).
8.50, 9.15, 11.05, 15.45, 17.00, 18.55, 23.45 «100 песень пра каханьне».
9.25, 17.10 «Па імені Барон». Сэрыял (Расея).
10.10 Сад мары. Перадача для дачнікаў.
10.35 Дак. сэрыял «Пары і дуэты-2». 1-я сэрыя.
11.15, 22.00 «Магія каханьня». Сэрыял.
12.20, 14.40 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Мэлядрама «Падары мне месячнае сьвятло».
15.20 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.55 «Гэта клясна!». Сэрыял.
16.25 5х5.
19.05 Гісторыя каханьня «Пунсовыя ветразі».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.20 Конкурс «Міс Эўропа-2002».
23.55 Драма «Апантанасьць».

## СТВ

5.00, 0.30 Музычны канал.
5.30, 14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
6.00, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.25, 15.30 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял. Заключная сэрыя.
6.50, 15.00 «Інспэктар Гаджэт». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.15 «24 гадзіны».
7.45, 20.05 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00 «Менск і менчукі».
8.05, 22.35 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: крымінальная камэдыя «Аўтамыйка». ЗША, 2001.
10.30 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.00, 20.25 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Сага пра Фарсайтаў». Тэлесэрыял.
12.30 «Сямейныя страсьці». Ток-шоў.
13.45, 18.35 «Каменская-2. Мужчынскія гульні». Тэлесэрыял.
16.20 Мультфільм.
16.50 «Такая прафэсія».
17.20 «Усё для цябе».
18.05 «Пакуль гарыць сьвечка».
19.50 «Навіны СНД».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.45 Кіно: трагікамэдыя «Зімовы вечар у Гаграх». СССР, 1986.
22.45 Кіно: трагікамэдыя «Каханьне і панажоўшчына». Італія, 1971.

## 8 канал

17.30 Мультпарад.
17.45 Трылер «Пастка».
19.40, 20.30 Тэлекрама.
19.45 Сэрыял «Шчасьлівыя».
20.40 Міжнародныя навіны з «Дойчэ Вэле».
20.45 «Вечарніца».
21.00 К-відэа «Топ-8».
21.10 Камэдыя «Таксі».

## Першы музычны канал

7.00 «Пад’ёмнік».
8.30, 16.00, 23.30, 0.15 MegaMix.
14.00 «V.I.P.онія».
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
0.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».

## АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.45 «Нашы навіны».
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Наступны» («Next»). 3-я сэрыя.
10.40 Чалавек і закон.
11.25 Дзіцячы сэрыял «Твінісы».
15.50 «Новы дзень». «Крылы».
16.20 Маст. фільм «Атрад спэцыяльнага прызначэньня». 5-я сэрыя, заключная.
17.30 «Самі з вусамі».
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.00 Сьвяточны канцэрт да Дня закаханых.
23.55 Рычард Гір у маст. фільме «Доктар Т. і яго жанчыны».

## РТР

8.35 Маст. фільм «Сямнаццаць імгненьняў вясны».
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 Сэрыял «Пуаро Агаты Крысьці. Экспрэс на Плімут».
17.50 Аншляг.
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Канцэрт да Дня ўсіх закаханых.
22.00 Клюб «Тэатар + ТБ». Сьвяточны капусьнік.

## Культура

15.10 95 год з дня нараджэньня Барыса Піятроўскага. «Мой Эрмітаж».
15.40 «Пушкін. Тысяча радкоў пра каханьне».
16.05 «Са столі».
16.35 «Дак. экран». «Уладзімер Аляксеевіч Ерафееў».
17.15 «Гербы Расеі».
17.30 Весткі.
17.40, 23.00 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 100 год з дня нараджэньня С.Гейчанкі. «Ахоўнік».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Дапамажыце Тэлеку».
19.45 «Вайна і мір». Маст. фільм. Фільм 4-ы. «П’ер Бязухаў».
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

## НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор’е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 Нацыянальная бясьпека: сахалінская пустыня.
10.50 Смачныя гісторыі.
14.35 «Не магу сказаць «кахаю». Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.10 «Кодэкс гонару». Баявік.
17.15 Крымінал.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Увесь Джэймз Бонд. Баявік «Жывеш толькі двойчы».
22.20 «Усё адразу!».
22.55 Кіно не для ўсіх. Камэдыя «Разьбіраючы Гары» (ЗША).

## Эўраспорт

10.00 Снаўборд.
10.30 Парусны спорт. Новая Зэляндыя. Паўтор.
11.30 Футбол. Кубак Лібэртадарэс. 2-і дзень. Паўтор.
13.30, 18.00 Футбол. Эўра 2004. Чэмпіянат Эўропы. Таварыскі матч. Францыя—Чэхія. Паўтор.
15.00, 20.00 Тэніс. WTA. Антвэрпэн. 1/4 фіналу. Жывая трансьляцыя.
16.30 Валейбол.
17.00 Футбол. Эўра 2004. Чэмпіянат Эўропы. Паўтор.
21.30 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Сан-Дыега.
22.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Швэцыя. Агляд.
23.30 Аўтаматаспорт. Часопіс.
23.45 Аўтагонкі на лёдзе. Клермонд.
0.30 Трыял у памшяканьні. Чэмпіянат сьвету. Тарына.
1.30 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
2.00 Аўтаматаспорт. Паўтор.

# 15 лютага субота

## БТ

7.00, 12.00, 15.00, 18.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.20 Існасьць. Духоўная праграма.
8.45 Слова Мітрапаліта Філарэта на Грамніцы.
9.05 «Усё нармальна, мама!».
9.45 Экран індыйскага кіно. «У пошуках брата». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 Тэлевізійны Дом кіно. Вынікі зьезду Саюзу кінэматаграфістаў Беларусі.
12.20 Да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. «Сындром распаленага сонца».
12.40 Падарожжа дылетанта. «Гутаркі. Жыцьцёвы шлях Сыгізмунда Чаховіча».
12.55 Сола для дэбютанта. Алеся Снапок-Сарокіна (тэатральная мастачка).
13.05 Плянэта АРТ.
13.35 Дак. сэрыял «Пары і дуэты-2».
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Вэстэрн «Сьцежкай асуджаных» (ЗША).
15.20 «Візавая эпапея». Відэафільм АТН.
15.40 Кухня КВК.
15.50 Камэдыйны сэрыял «Лі Эванс. І што цяпер?».
16.20 Мэлядрама «Раз схлусіўшы».
18.20 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.05 Драма «Мусульманін».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Дэтэктыў «Галаваломка» (ЗША—Канада).
23.45 Начны музычны этэр.

## СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Цуды надвор’я». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 20.00 «Менск і менчукі».
9.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Адпачывай».
9.45 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark»: «Падарожжа да цэнтру Зямлі».
10.50, 20.10 Тэлесэрыял «Вялікі перапынак». 1-я сэрыя. СССР, 1972.
12.00 «Разам».
12.30 «Плянэта людзей».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: дэтэктыў «Задача з трыма невядомымі», 1-я сэрыя. СССР, 1979.
14.40 «Відавочца».
15.15 «Чыста па жыцьці». Камэдыйны сэрыял.
15.50 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.15 «Вуншпунш». Мультсэрыял.
16.45 Мультфільм.
17.00 «Аўтапанарама».
17.20 Кіно: камэдыя «Жандар і жандармэткі». Францыя, 1982.
19.30 «24 гадзіны».
19.45 Навіны СНД.
21.15 Кіно: баявік «Аўганец».
22.55 «Рэактыўны бокс».
23.10 Кіно: трылер «Спакушальнік». ЗША, 2001.

## 8 канал

15.00 Фільм-катастрофа «На апошнім беразе».
18.20, 20.45 Тэлекрама.
18.30 Праграма мультфільмаў.
19.00 Прыгодніцкі фільм «Багдадзкі злодзей».
20.45 «Вечарніца».
21.10 Крымінальная драма «Адчайны».

## Першы музычны канал

8.00, 12.15, 17.00 MegaMix.
12.00 «Заваёўнікі кантынэнтаў».
15.00 Супэрфінал акцыі «Stop & Go».
16.00 Музыка.RU.

## АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 Смак.
10.30 Сьмехапанарама.
11.05 «Падарожжы натураліста».
11.35 Таямніцы стагодзьдзя. «Афэра Ільліча».
12.15 Алегу Яфрэмаву прысьвячаецца. Юры Любімаў, Ала Пугачова, Алена Камбурава, Ігар Кваша і іншыя ў тэатры «Сучасьнік».
13.20 Ералаш.
13.30 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
14.10 «Каб памяталі...» Мікалай Яроменка-малодшы.
14.45 М.Яроменка-малодшы і Н.Андрэйчанка ў мэлядраме «Падары мне месячнае сьвятло».
16.20 «У сьвеце жывёл».
16.55 Камэдыя «Ўтаймаваньне наравістай».
18.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 «Нашы навіны».
21.00 «Апошні герой-3».
22.05 Прэм’ера. «Бар «Брыдкі каёт». Мэлядрама. ЗША, 2000 год.
23.50 Робэрт Дэ Ніра ў маст. фільме «Франкенштайн Мэры Шэлі».

## РТР

9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў «Падарункі па тэлефоне». 1977 г.
15.00 Прэміі «Оскар» і Брытанскай кінаакадэміі. Фільм Стывэна Сьпілбэрга «Блізкія кантакты трэцяй ступені» (ЗША).
17.00 Мая сям’я.
18.00 Аншляг.
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 Сусьветнае кіно. Брус Уіліс і Сара Джэсыка Паркер у вострасюжэтным фільме «На адлегласьці ўдару» (ЗША). 1993 г.
21.55 Апошні сэанс. Прэм’ера. Джон Траволта ў маст. фільме «Дачка генэрала» (ЗША). 1999 г.

## Культура

11.20 ГЭГ.
11.35 «Графаман».
12.00 Дзіцячы сэанс. «Сардэчна запрашаем, ці Пабочным уваход забаронены!» Маст. фільм.
13.15 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.45 «До мажор».
14.15 Прэм’ера. А.Грыбаедаў. «Гора ад розуму». Тэлевэрсія спэктаклю Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатру.
16.45 Магія кіно.
17.15 «Сфэры».
17.55 Трансьляцыя зь Вялікага тэатру Расеі балету «Сабор Парыскай Божай Маці» ў харэаграфіі Раляна Пеці.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Ваш выбар, мадам!» Маст. фільм.
22.45 Афіша на заўтра.
22.50 «Фрак народу».

## НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00 Сёньня.
9.05 «Кулінарны паядынак»
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Аўтастопам па Амэрыцы». «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Дэтэктыў «Забіць «Шакала».
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 «Шоў Алены Сьцепаненкі».
17.05 Сэрыял «Бунтоўная плянэта: сьнежная навальніца».
18.30 Арнольд Шварцэнэгер у баевіку «Сьціральнік» (ЗША).
20.35 Трылер «Выяўленьне» (ЗША).
22.55 Супэрбокс. Дэвід Туа супраць Хасыма Рахмана.

## Эўраспорт

9.30 Прыгоды на прыродзе. Паўтор.
10.00 Фрыстайл. Лаакс. Паўтор.
10.30 Горныя лыжы. Сант-Морыц. Жывая трансьляцыя.
11.00 Горныя лыжы. Сант-Морыц. Жанчыны. Слалам. 1-я спроба.
12.15 Біятлён. Кубак сьвету. Хальмэнкёльн. Мужчыны. Спрынт. Жывая трансьляцыя.
13.45 Горныя лыжы. Сант-Морыц. Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Жывая трансьляцыя.
15.15 Біятлён. Кубак сьвету. Хальмэнкёльн. Жанчыны. Спрынт. Жывая трансьляцыя.
16.30 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Ляйпцыг.
18.30 Лыжная гонка. Асіяга.
19.00 Бабсьлей. Чэмпіянат сьвету. Лакплэйс. 2-я спроба.
20.00 Тэніс. Антвэрп. WTA. Паўфінал.
21.30 Парусны спорт. Новая Зэляндыя.
23.00 Экстрэмальныя віды спорту. Часопіс.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.15 Тэніс. Сан-Хасэ. Паўфінал.
1.45 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Сан-Дыега. Паўтор.

# 16 лютага нядзеля

## БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал. Праграма пра войска.
9.05 Алхімія слова.
9.10 «Сузор’е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.40 Экран індыйскага кіно. «У пошуках брата». 2-я сэрыя.
11.20 Сад мары.
11.45 Музэюм. «Урэцка-Налібоцкае шкло».
12.20 «Усё нармальна, мама!».
13.05 «Ваша лято».
13.45 «Ёсьць толькі міг...».
14.10 «Маршрут №...».
14.15 Вэстэрн «Сьцежкай асуджаных» (ЗША).
15.20 «Рынкі сьвету». Дак. сэрыял.
15.45 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.40 Кліп-абойма.
17.20 Камэдыя «Кай са скрыні» (Нямеччына).
18.55 Гісторыя каханьня ў драме «Неўтаймоўныя сэрцы» (ЗША).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.45 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор’я.
22.05 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Джоэль Касамаёр — Нэйт Кэмпбэл. Трансьляцыя з ЗША.
22.50 Крымінальная драма «Ў ложку з ворагам» (ЗША).

## СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта»: «Усё пра сабак», «Выратавальнікі». Дак. фільмы.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «Філярманічны тыдзень».
9.00 «СТВ-спорт».
9.10 «Партрэт у інтэр’еры».
9.25 «Аўтапанарама».
9.45 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark»: «Падарожжа да цэнтру Зямлі».
10.50, 20.10 Тэлесэрыял «Вялікі перапынак». 2-я сэрыя. СССР, 1972.
12.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 Кіно: дэтэктыў «Задача з трыма невядомымі», 2-я сэрыя. СССР, 1979.
14.40 «Мая Кармэн». Відэафільм.
15.15 «Відавочца».
15.50 «Вовачка-2». Камэдыйны сэрыял.
16.25 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.50 «Такая прафэсія».
17.10 Навіны сусьветнай шоў-індустрыі.
17.40 «Вар’яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.25 «168 гадзін».
19.10 «Усё для сябе».
19.40 «Пакуль гарыць сьвечка».
21.20 Кіно: баявік «Аўганец-2».
22.50 «Гульнявы рэфлекс».
23.00 Навіны СНД.
23.15 «Бацюшка». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
23.30 Кіно: Робэрт Дэ Ніра ў драматычным трылеры Мартына Скарсэзэ «Таксіст». ЗША, 1976.

## 8 канал

15.00 «У госьці да казкі». «Доктар Айбаліт».
16.30 «Эўропа сёньня».
17.00 Сэрыял «Горац».
17.45 Мультфільм «Жыў-быў сабака».
18.00 «Афонева адысэя».
19.00 Маст. фільм «Дзень добры, я ваша цётка!».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Тэлекрама.
21.10 Маст. фільм «Мумія».

## Першы музычны канал

8.00, 12.45, 0.00 MegaMix.
12.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
23.30 «Поцемкі».

## АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.25 Служу Расеі!
8.50 Дыснэй-клюб: «Цімон і Пумба».
9.15 «Усе падарожжы каманды Кусто».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
11.55 Фільм Паўла Шарамета. «Свая чужая зямля».
12.35 «Клюб падарожнікаў».
13.15 Ералаш.
13.30 Дыснэй-клюб: «Качыныя гісторыі».
14.10 «Партрэт у сярэднявечным стылі». Дак. фільм цыклу «Наш агульны дом».
14.25 «Валадар смаку».
15.20 Разумніцы й разумнікі.
15.45 Ток-шоў «Выбар».
16:00 «Новы дзень». Клоўн Карандаш.
16.25 Камэдыя «Бедная Саша».
18.15 Жывая прырода. «Браты па крыві».
19.05, 21.10 Сьвяточны канцэрт «Газпрому — 10 год».
20.30 «Контуры».
22.15 Харысан Форд у камэдыі «Шэсьць дзён, сем начэй».
0.05 Часы.

## РТР

9.15 «Ранішняя размова».
9.45 «Гарадок». Дайджэст.
10.15 Парад камэдый. «Самалётам, цягніком, аўтамабілем» (ЗША). 1987 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Вакол сьвету.
14.15 Дыялёгі пра жывёл.
15.10 Прэм’ера. «Сьвет на мяжы».
15.45 Пакой сьмеху.
16.40 Камэдыя «Ўнутраная прастора» (ЗША). 1987 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 Сусьветнае кіно. Вострасюжэтны фільм «Пад замком» (ЗША). 1989 г.
22.50 Апошні сэанс. Прэм’ера. Маст. фільм «Радыёхваля» (ЗША). 2000 г.

## Культура

11.20 Нядоўгія гісторыі.
11.35 Прагулкі па Брадвэі.
12.00 Дзіцячы сэанс. «Ключ». Мультфільм.
13.00 Мой цырк.
13.25 «Акадэмія паліцэйскіх сабак». Дак. сэрыял.
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.20 «У сьвеце танцу». «Баварскі Дзяржаўны балет».
16.15 «Кіно, якое было». «Вадзім Юсаў. Галоўны апэратар».
16.55 «Чорны манах». Маст. фільм.
18.20 Сьмеханастальгія.
19.00 «Вяртаньне ў Брайдсхед». Тэлесэрыял. 8-я сэрыя.
19.55 «Дом актора». «Сьвятлана Варгузава і...»
20.35 «Лёгкі жанр».
21.05 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.30 «Культ кіно». «Гары, мая паненка». Маст. фільм.
22.50 Афіша на заўтра.
22.55 Нон-стоп падарожжа зь Мішэлем Пэтручыяні.

## НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 14.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял «Бунтоўная плянэта».
10.05 «Расьлінная жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 «Уплыў».
11.40 «Гандляры сьмерцю». «Прафэсія — рэпарцёр».
12.05 Камэдыя «Восеньскія спакусы».
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Гісторыі паляўнічага на кракадзілаў».
15.45 «Мэта — маскоўская прапіска». Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 Блякбастэр «Чалавек у жалезнай масцы» (ЗША).
20.00 «Надоечы».
21.30 Баявік «Чысьцільшчык» (ЗША).
23.25 Сэрыял «Клан Сапрана». 16-я сэрыя (ЗША).

## Эўраспорт

9.30 Скелетон. Чэмпіянат сьвету. Нагана. Жанчыны. 2-я спроба.
10.30 Горныя лыжы. Чэмпіянат сьвету. Слалам, мужчыны. 1-я спроба. Жывая трансьляцыя.
12.00 Скелетон. Чэмпіянат сьвету. Нагана. Мужчыны. 2-я спроба.
13.00 Біятлён. Кубак сьвету. Халмэнкёльн. Гонка-перасьлед. Жанчыны. Жывая трансьляцыя.
13.45 Горныя лыжы. Чэмпіянат сьвету. Слалам, мужчыны. 2-я спроба. Жывая трансьляцыя.
15.00 Біятлён. Кубак сьвету. Гонка-перасьлед. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
16.00 Бабсьлей. Чэмпіянат сьвету. Двойкі, мужчыны. 3-я спроба. Жывая трансьляцыя.
17.00 Лыжныя гонкі. Кубак сьвету. 5 км, вольны ход. Жанчыны.
18.00 Бабсьлей. Чэмпіянат сьвету. Двойкі, мужчыны. 4-я спроба. Жывая трансьляцыя.
19.15 Тэніс. Антвэрпэн. Турнір WTA. Фінал.
20.30 Наскар. Дайтона.
21.30 Парусны спорт. Кубак Амэрыкі.
22.30 Бокс.
1.00 Тэніс. Турнір АТР у Сан-Хасэ. Фінал.


Наша Ніва

Нагадваем, што падпіскаю газэта абыходзіцца таньней.
Падпісны індэкс **63125**.
Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі.
На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».
Дык падпісвайся!



# Кіравацьбудуць дактары

**На выбарах у гарсавет улада ставіць на мэдыкаў, пэдагогаў і чыноўнікаў.**

Канчаткова вызначыліся сьпісы кандыдатаў у дэпутаты сталічнага гарсавету. Хоць апазыцыя страціла шэраг пэрспэктыўных прэтэндэнтаў, у большасьці акругаў адбудзецца двубой лукашэнкаўцаў і дэмакратаў.

Цяперашняму старшыню гарсавету Ўладзімеру Папкоўскаму, які балятуецца ў заможнай Старавіленскай акрузе, кінула пальчатку Ілона Ўрбановіч-Саўка (БНФ), кіраўніца прэс-службы Беларускай асацыяцыі журналістаў. На мінулых выбарах Папкоўскі ў гэтай самай акрузе перамог ЖЭСаўскага начальніка, сябра «Народнай грамады». Спн.Урбановіч-Саўку гэта не палохае. Рыхтаваць кампанію ёй дапамагаюць муж, мовазнаўца Зьміцер Саўка, і 8-гадовая дачка Караліна. Трэці прэтэндэнт, машыніст з фарфоравага заводу Ўладзімер Левандоўскі (КПБ), выглядае ў гэтай акрузе на аўтсайдэра.

Такія ж маладыя супернікі і малая колькасьць канкурэнтаў у іншых кандыдатаў-чыноўнікаў. Намесьніку кіраўніка Партызанскае райадміністрацыі супрацьстаіць 26-гадовы і «часова беспрацоўны» Вадзім Канапацкі з БНФ. Намесьніку кіраўніка Першамайскае — 23-гадовы сьлесар Максім Трубач (ЛДП). Намесьніцы кіраўніка Цэнтральнае — 33-гадовы лідэр Асацыяцыі маладых палітыкаў Аляксандар Цынкевіч (АГП). Яшчэ два кіраўнікі раённага ўзроўню маюць супернікамі вылучэнцаў ЛДП.

Тыповага кандыдата ад «партыі лукашэнкаўцаў» лёгка вылічыць па тых акругах, дзе сам-насам з адным праціўнікам ідуць лідэры апазыцыі.

Аднаму зь лідэраў БНФ Алесю Бяляцкаму супрацьстаіць беспартыйная Ірына Жарыкава, намесьніца галоўнага доктара 27-е паліклінікі (Карбышаўская акруга). Што цікава, яна таго ж году нараджэньня, што і Бяляцкі. Праваабаронцу Сяргею Цурку (БНФ) процістаіць галоўны доктар 1-е паліклінікі (Заслаўская акруга). Вэтэранцы БНФ Валянціне Трыгубовіч — дырэктарка СШ№162 (Ангарская). Вядомаму яшчэ па Беларускім Згуртаваньні Вайскоўцаў Сяргею Чыславу — галоўны доктар 8-й дзіцячай паліклінікі (Ясенінская). Юрыстцы Раісе Міхайлоўскай (БСДП «Народная грамада») — галоўны доктар кансультацыйна-дыягнастычнага цэнтру (Слабадзкая). Міхаілу Ганчарыку (БСДП-НГ) — дырэктар СШ №150 (Масюкоўшчынская). Навукоўцу Генадзю Прасьнякову (ПКБ) — галоўны доктар 1-й клінічнай больніцы (Калінінская). Галоўныя дактары, пэдагогі, вайсковец, два дэканы, рэктар, дырэктары ПТВ і «Кераміну» супрацьстаяць сябрам ЛДПБ, ПКБ, Партыі працы, АГП яшчэ ў 10 акругах.


**Ілона Ўрбановіч-Саўка (БНФ) кінула пальчатку старшыні Менскага гарсавету.**

Лідэр ініцыятыўнае групы Сямёна Домаша на выбарах 2001 г., юрыст Яўген Лабановіч (АГП), які сабраў у сваю падтрымку аж 3500 подпісаў, паставіўшы, відаць, рэкорд гэтае кампаніі, таксама мае самым сур'ёзным супернікам у сваёй Малінаўскай акрузе дырэктарку гімназіі №192.

Гарачая канкурэнцыя чакаецца і ў Чыгуначнай акрузе. Там сакратару ўправы БНФ Аляксею Кавальцу і гісторыку Ніне Стужынскай (намесьніца старшыні БСДП-НГ) будзе супрацьстаяць найперш беспартыйны дэкан аднаго з факультэтаў Унівэрсытэту культуры. Мікола Статкевіч ужо заклікаў А.Кавальца зьняць кандыдатуру на карысьць сваёй намесьніцы.

Іншая складаная акруга — Уруцкая. Экс-дэпутат Вярхоўнага Савету Павал Знавец зь незарэгістраванай АСДП будзе тут спрачацца зь іншым сацыял-дэмакратам, але з Народнай Грамады, Аляксандрам Арастовічам, і трыма бізнэсоўцамі.

Надзіва мала ідзе бізнэсоўцаў і гаспадарнікаў. Сярод іх заўважных дырэктары гандлёвых дамоў «Паркброе» Сяргей Пігараў і «Лукойл» Уладзімер Крук, дырэктар агенцтва нерухомасьці «Дзінас» Віктар Шанюкевіч. Усе трое яўна ад лукашэнкаўцаў, бо маюць выключна «партыйных» канкурэнтаў. Вострая канкурэнцыя чакаецца ў Любімаўскай акрузе, дзе сыну былога прэм'ера БНР Яўгену Калубовічу (БНФ) і намесьніку старшыні АГП Сяргею Альферу ад уладаў будзе супрацьстаяць бізнэсовец Генадзь Літвінаў.

Лукашэнкаўцы сфармавалі сваю партыю з чыноўнікаў, пэдагогаў і мэдыкаў. Гэтыя тры сацыяльныя групы залежаць ад дзяржбюджэту, найменш схільныя да фармаваньня лабісцкіх груповак і, у адрозьненьне ад бізнэсоўцаў і сілавікоў, не зьбіраюцца змагацца за ўладу. Ёсьць і той фактар, што яны найменш зьвязаныя з Расеяй.

Сустрэчы сам-насам кандыдатаў ад апазыцыі і ад улады дазволяць наўпрэшце праясьніць папулярнасьць тых і другіх. Адсутнасьць у бюлетэнях лідэраў дэмакратычных сілаў і непрэзэнтаванасьць апазыцыі ў выбарчых камісіях перашкаджаюць такія сустрэчы ў бай паміж супернікамі розных вагавых катэгорыяў. Але і Давіды, здараецца, перамагаюць Галіяфаў.

**Мікола Бугай**

## Сьпіс кандыдатаў у дэпутаты Менскага гарсавету

**ЛЕНІНСКІ РАЁН**

**Малінінская акруга №9**

**Букланаў** Васіль, 1950, дырэктар ПТВ №11 лёгкай прамысловасьці. **Мельнікаў** Аляксандар, памочнік дэпутата палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу. **Навумаў** Фёдар, 1946, намесьнік галоўнага бухгальтара Менскага электратэхнічнага заводу імя В.Казлова. ПКБ.

**Ракасоўская акруга №10**

**Казлоўскі** Сяргей, 1974, галоўны рэдактар газэты «Молодежный проспект». **Хаменка** Сяргей, 1966, намесьнік камандзіра вайсковай часьці 5448 — начальнік штабу.

**Серабранская акруга №11**

**Кузьміч** Рэгіна, 1950, начальніца ўпраўленьня сацыяльнай абароны адміністрацыі Ленінскага раёну. **Хішчанка** Анатоль, 1958, дырэктар навукова-вытворчага таварыства «Вольніца». ЛДП.

**Пляханаўская акруга №12**

**Драздоўскі** Барыс, 1943, намесьнік начальніка службы тэлемэханікі й сувязі прадпрыемства РУП «АДУ». БНФ. **Мяцечка** Жана, 1964, настаўніца сярэдняй школы. ПКБ. **Панкратава** Марына, 1971, загадчыца аддзяленьня Цэнтру гігіены і эпідэміялёгіі Ленінскага раёну.

**Маякоўская акруга №13**

**Заграй** Уладзімер, 1941. Інжынэр-мэханік, пэнсіянэр. КПБ. **Мажэйка** Леанід, 1954, дырэктар Аўтобуснага парку №2.

**Купалаўская акруга №14**

**Дзенісевіч** Андрэй, 1982, бухгальтар ТАА «Нікаўт». **Еўдакімовіч** Андрэй, 1979, асьпірант БДУ. Партыя працы. **Іода** Аляксей, 1952, дырэктар Дзяржаўнага музэю прыроды і экалёгіі. **Стальная** Ірына, 1950, старшыня Менскага абласнога камітэту прафсаюзу работнікаў дзяржаўных і іншых установаў. КПБ. **Ткачэнка** Кацярына, 1975, карэспандэнтка «Белорускской деловой газеты». АГП.

**КАСТРЫЧНІЦКІ РАЁН**

**Чыгуначная акруга №15**

**Кавалец** Аляксей, 1953, выкладчык Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэю імя Я.Коласа. БНФ. **Каралькоў** Мікалай, 1941, дэкан факультэту Ўнівэрсытэту культуры. **Стужынская** Ніна, старшая навуковая супрацоўніца Інстытуту гісторыі НАН. Народная Грамада. **Хішчанка** Алена, 1960, начальніца аддзелу навукова-вытворчага таварыства «Вольніца». ЛДП.

**Чкалаўская акруга №16**

**Лобань Мікалай**, 1946, дырэктар Менскага абласнога прадпрыемства «Мінаблаграхімізацыя». КПБ. **Манчанка** Алег, 1971, камэрцыйны дырэктар Менскага авіярамонтнага заводу. **Раманько** Сяргей, 1972, індывідуальны прадпрымальнік. Народная Грамада.

**Аэрафлёцкая акруга №17**

**Дамброўская** Алена, 1948, дырэктар СШ №71. **Эсавулаў** Леанід, 1945, вартаўнік дзіцячай харэаграфічнай школы. КПБ.

**Кастрычніцкая акруга №18**

**Мудрачэнка** Сяргей, 1970, галоўны бухгальтар УП «Белінфармрэстаўрацыя». БНФ. **Расолька** Васіль, 1948, загадчык сэктару «Рэспубліканскага інстытуту прафэсійнай адукацыі». ПКБ. **Фёдараў** Вадзім, 1958, старшыня рады рэгіянальнага прафсаюзу «Інтэгралу».

**Асаналіеўская акруга №19**

**Маляванаў** Уладзімер, 1948, дырэктар заводу «Будфарфор» ААТ «Керамін». **Чупін** Яўген, 1954, начальнік участку НДІ радыёматэрыялаў. ЛДП.

**МАСКОЎСКІ РАЁН**

**Купрыянаўская акруга №20**

**Жукоўскі** Віктар, 1959, галоўны санітарны лекар Цэнтру гігіены і эпідэміялёгіі Маскоўскага раёну. **Іваніцкі** Аляксандар, 1936, дырэктар навукова-вытворчага прадпрыемства «Санд». ПКБ. **Касьпярчук** Валеры, 1972, дырэктар ТАА «Элітпрам». ЛДП. **Люліна Алена**, 1955, дырэктарка ТАА «Лекса-98». БНФ. **Татарынаў** Мікалай, 1955, загадчык інтэрнату прадпрыемства «Геасэрвіс». АГП. **Якаўлеў** Аляксей, 1977, майстар лесу Менскай лесапаркавай гаспадаркі. КПБ.

**Грушаўская акруга №21**

**Васільчанка** Яўген, 1981, студэнт БДУ. **Лабачоў** Іван, 1944, намесьнік старшыні Беларускага таварыства абароны спажыўцоў. АГП. **Лях** Міхаіл, 1951, інжынэр па рамонце і эксплюатацыі бранятанкавай тэхнікі, пэнсіянэр. ЛДП. **Таўкачоў** Віктар, 1949, дырэктар Менскага вагонарамонтнага заводу імя А.Мясьнікова.

**Праўдзінская акруга №22**

**Карлоўскі** Мікалай, 1957, намесьнік кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёну. **Семяняка** Жанна, 1962, бухгальтарка УП «Баўхольц». ЛДП.

**Любімаўская акруга №23**

**Альфер** Сяргей, 1954, спэцыяліст-юрысконсульт ГА «Асацыяцыя садзейнічаньня эканамічнаму разьвіцьцю». АГП. **Калубовіч** Яўген, 1942, настаўнік ліцэю №1. Партыя БНФ. **Куцэр** Міхаіл, 1978, інжынэр упраўленьня мэханізацыі №70 ААТ «Трэст №15 «Спэцбуд». ПКБ. **Кульба** Ўладзімер, 1960, вядучы інжынэр навукова-вытворчага кааператыву «Вэктар». ЛДП. **Літвінаў** Генадзь, 1958, дырэктар ТАА «Бондзі».

**Малінаўская акруга №24**

**Дзеранчук** Павал, 1980, трэнэр-выкладчык Дзіцячай юнацкай спартова-тэхнічнай школы Алімпійскага рэзэрву БелАСТТ па водных відах спорту. ЛДП. **Лабановіч** Яўген, 1975, спэцыяліст рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Прававая ініцыятыва». АГП. **Ракаў** Міхаіл, 1959, намесьнік генэральнага дырэктара таварыства «Моладзевы інвэстыцыйны цэнтар». Беларуская сацыяльна-спартовая партыя. **Шпак** Надзея, 1951, дырэктарка гімназіі №192.

**Ясенінская акруга №25**

**Восіпік** Андрэй, 1973, інжынэр замежнага прадпрыемства «Роштоф». ЛДП. **Філановіч** Расьціслаў, 1956, галоўны лекар 8-й дзіцячай паліклінікі. **Чыслаў** Сяргей, 1967, інжынэр прадпрыемства «Тэхманал» ТАА «Беларускае таварыства інвалідаў».

**Слабадзкая акруга №26**

**Міхайлоўская** Раіса, 1960, выканаўчая дырэктарка грамадзкага аб'яднаньня «Прававая дапамога насельніцтву». Народная Грамада. **Таўкачоў** Анатоль, 1949, галоўны лекар «Менскага кансультатыўна-дыягнастычнага цэнтру».

**ФРУНЗЭНСКІ РАЁН**

**Сухараўская акруга №27**

**Каляга** Ўладзімер, 1956, намесьнік старшыні Рэспубліканскага камітэту Беларускага прафсаюзу мэталістаў. Партыя працы. **Панасюк** Васіль, 1966, намесьнік дырэктара Менскай цеплаэлектрацэнтралі №4.

**Адоеўская акруга №28**

**Іваноўскі** Іван, 1949, дырэктар Менскага заводу будматэрыялаў. **Кашо** Аляксандар, 1940, галоўны тэхноляг аддзелу «Жылкамунтэхніка». ПКБ.

**Заходняя акруга №29**

**Канойка** Канстанцін, 1951, дырэктар прадпрыемства «Сьвятлопрыбор» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. **Швайба** Дзьмітры, 1980, старшыня пярвічнай арганізацыі прафсаюзу навучэнцаў Менскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжу. Партыя працы.

**Адзінцоўская акруга №30**

**Данілава** Натальля, 1974, бухгальтарка гарадзкога дзіцяча-падлеткавага псыханэўралягічнага дыспансэру. ЛДП. **Карпухін** Уладзімер, наладчык кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі МАЗу. ПКБ. **Рымашэўскі** Віталь, 1975, начальнік аддзелу ТАА «Інтэр-Транк». АГП. **Чарнавусава** Вольга, 1950, дырэктарка тэхналягічнай гімназіі №13.

**Пушкінская акруга №31**

**Кірута** Вадзім, 1974, часова не працуе. ЛДП. **Курэк Натальля**, 1951, галоўная лекарка радзільні №2.

**Кунцаўшчыцкая акруга №32**

**Кузьміч** Мікалай, 1958, начальнік аўтакалёны Аўтакамбінату №6. ПКБ. **Навумчык** Аляксандар, 1953, камэрцыйны дырэктар УП «Сучасныя мэдычныя тэхналёгіі». ЛДП. **Пігараў** Сяргей, 1961, дырэктар Гандлёвага дому «Паркброе». **Церашкоў** Андрэй, 1970, намесьнік генэральнага дырэктара беларуска-польскага прадпрыемства «Аркадыя». БНФ.

**Масюкоўшчынская акруга №33**

**Ганчарык** Міхаіл, 1962, юрысконсульт ТАА «Столкар». Народная Грамада. **Чуткоў** Аляксандар, 1946, дырэктар школы мастацтваў №150.

**Матусевіцкая акруга №34**

**Гарбачоў** Леанід, 1976, мэнэджэр УП «Эксімінструмэнт». Народная Грамада. **Кудзелка** Саўлюс, 1964, індывідуальны прадпрымальнік. **Мікіцкі** Юры, 1966, дырэктар дзяржпрадпрыемства «Інфатэхпрам-М». **Субат** Васіль, 1959, інжынэр Менскага заводу колавых цягачоў. БНФ.

**Жудроўская акруга №35**

**Дусенка** Зорыя, 1955, дырэктарка Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжу. **Краўчанка** Ўладзімер, 1941, галоўны лекар 7-й стаматалягічнай паліклінікі. **Лісічонак** Сяргей, 1980, студэнт БДУ. БНФ. **Шумілаў** Валеры, 1946, лекар хуткай дапамогі Менскага раённага тэрытарыяльнага мэдычнага аб'яднаньня. Рэспубліканская партыя.

**Кальварыйская акруга №36**

**Волкаў** Іван, 1952, генэральны дырэктар Беларускага пратэзна-артапэдычнага аднаўленчага цэнтру. **Лабаноўскі** Сяргей, 1959, намесьнік цэху УП «Прамсувязь». ПКБ.

**ЦЭНТРАЛЬНЫ РАЁН**

**Машэраўская акруга №37**

**Гормаш** Павал, 1980, малодшы навуковы супрацоўнік НДІ Міністэрства эканомікі. Народная Грамада. **Кобрынскі** Міхаіл, 1951, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі фізкультуры. **Юбіцкі** Дзяніс, 1977, юрысконсульт УП «Дом сьвятла». АГП.

**Заслаўская выбарчая акруга №38**

**Крамко** Людміла, 1951, галоўны лекар 1-й клінічнай паліклінікі. **Цурко** Сяргей, 1957, адвакат юркансультацыі Партызанскага раёну. БНФ.

**Старавіленская акруга №39**

**Левандоўскі** Уладзімер, 1961, машыніст кампрэсарных установак ААТ «Менскі парцалянавы завод». КПБ. **Папкоўскі** Уладзімер, 1945, старшыня Менскага гарсавету. **Урбановіч-Саўка** Ілона, 1972, кіраўнічка прэс-службы Беларускай асацыяцыі журналістаў. БНФ.

**Нававіленская акруга №40**

**Лагуновіч** Валянціна, 1949, намесьніца кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёну. **Цынкевіч** Аляксандар, 1969, прэзыдэнт Беларускага аб'яднаньня маладых палітыкаў. АГП. **Яцук** Аляксандар, 1971, мантажнік «Менскэнэргаспэцрамонт». КПБ.

**САВЕЦКІ РАЁН**

**Варвашэнеўская акруга №41**

**Паноў** Віталь, 1972, часова не працуе. ЛДП. **Савіцкі** Сьвятаслаў, 1952, начальнік 432 Галоўнага вайсковага клінічнага шпіталю Ўзброеных Сілаў. **Сегліна** Ніна, 1951, галоўная бухгальтарка ТАА «Джэ-ві-сэт». Рэспубліканская партыя. **Усошын** Мікалай, 1979, сьлесар-станочнік, часова не працуе. АГП. **Шчыгельская** Крысьціна, 1982, студэнтка Інстытуту парлямэнтарызму і прадпрымальніцтва.

**Куйбышаўская акруга №42**

**Філіпава** Тацяна, 1953, галоўны лекар 34-й клінічнай паліклінікі. **Шынкевіч** Рыта, 1976, часова не працуе. ЛДП.

**Багдановіцкая выбарчая акруга №43**

**Кавалёва** Лідзія, 1946, індывідуальны прадпрымальнік. ЛДП. **Куневіч** Алег, 1967, намесьнік дэкана факультэту Нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту.

**Лагойская акруга №44**

**Даронін** Яўген, 1958, дырэктар прадпрыемства «Палькор». ЛДП. **Лягчылаў** Аляксандар, 1946, дырэктар Менскага дзяржаўнага гандлёвага каледжу.

**Мірашнічэнкаўская акруга №45**

**Крук** Уладзімер, 1957, выканаўчы дырэктар таварыства «Гандлёвы дом «Лукойл». **Курс** Андрэй, 1973, асыстэнт катэдры Беларускага пэдагагічнага ўнівэрсытэту імя М.Танка. ЛДП.

**ПЕРШАМАЙСКІ РАЁН**

**Карбышаўская акруга №46**

**Бяляцкі** Аляксандар, 1962, выкладчык, філёляг. БНФ. **Жарыкава** Ірына, 1962, нам. галоўнага лекара 27-й паліклінікі.

**Валгаградзкая акруга №47**

**Рашацько** Генадзь, 1962, намесьнік кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёну. **Трубач** Максім, 1979, сьлесар-інструмэнтальшчык МТЗ. ЛДП.

**Калінінская акруга №48**

**Прасьнякоў** Генадзь, 1947, малодшы навуковы супрацоўнік Інстытуту надзейнасьці і даўгавечнасьці машын НАН. ПКБ. **Сердзючэнка** Мікалай, 1950, галоўны лекар 1-й клінічнай больніцы.

**Каліноўская акруга №49**

**Лаўранюк** Марк, 1953, пэнсіянэр. КПБ. **Шанюкевіч** Віктар, 1954, дацэнт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту.

**Шугаеўская акруга №50**

**Данілаў** Юры, 1974, часова не працуе. **Пужэвіч** Таісія, 1949, дырэктарка Малочнай кухні «Татошка».

**Уруцкая акруга №51**

**Арастовіч** Аляксандар, 1952, дацэнт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту. Народная Грамада. **Грышын** Генадзь, 1950, намесьнік дырэктара ТАА «Прыбор-сэрвіс». **Знавец** Павал, 1967, юрыст, часова не працуе. **Лук'янаў** Юры, 1954, старшыня штабу ГА «Моладзевы жылы комплекс гораду Менску». **Пестракоў** Сяргей, 1959, генэральны дырэктар ТАА «Будфінанс».

**Усходняя акруга №52**

**Мацкевіч** Іван, 1947, кіраўнік адміністрацыі Першамайскага раёну. **Шунько** Мікалай, 1948, брыгадзір аўтастаянкі №21 прадпрыемства «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі Менгарвыканкаму». ЛДП.

**ПАРТЫЗАНСКІ РАЁН**

**Мендзялееўская акруга №53**

**Кішэя** Андрэй, 1966, індывідуальны прадпрымальнік. **Косар** Станіслаў, 1962, інкасатар Менскага абласнога ўпраўленьня «Белаграпрамбанку». ЛДП. **Сіманін** Уладзімер, 1952, кіраўнік сялянскай гаспадаркі «Сімяон». **Смольскі** Сяргей, 1953, генэральны дырэктар ААТ «Постгандаль».

**Першамайская акруга №54**

**Асташонак** Аляксандар, 1959, начальнік аддзелу Менскага электратэхнічнага заводу імя Казлова. ПКБ. **Канапацкі** Вадзім, 1976, перакладчык, часова не працуе. Партыя БНФ. **Фурсаў** Аляксандар, 1955, намесьнік кіраўніка адміністрацыі Партызанскага раёну.

**Трактаразаводзкая акруга №55**

**Ішчанка** Віталь, 1964, вайсковы інжынэр сувязі, сацыёляг. **Карцаў** Аляксандар, 1955, старшыня прафкаму МТЗ. **Кашавы** Аляксандар, 1951, сьлесар мэханазборачных работ МТЗ. ПКБ. **Міхалёў** Ігар, 1958, юрыст замежнага прадпрыемства «Беллатронікс». КПБ. **Шынкарык** Ігар, 1967, індывідуальны прадпрымальнік. АГП.

**ЗАВОДЗКІ РАЁН**

**Ахоцкая акруга №1**

**Даўгала** Аляксандар, 1970, начальнік аддзелу ТАА «Чысты сьвет». Беларуская сацыяльна-спартовая партыя. **Кабанава** Валянціна, 1953, галоўная бухгальтарка Менскага раённага грамадзкага аб'яднаньня былых вязьняў канцлягераў. Народная Грамада. **Хлышчанка** Ірына, 1964, загадчыца аддзяленьня 17-й паліклінікі.

**Ангарская акруга №2**

**Корчык** Юры, 1973, выкладчык Менскай ПТВ №9. КПБ. **Трыгубовіч** Валянціна, 1947, журналістка, пэнсіянэрка. БНФ. **Юргелевіч** Галіна, 1954, дырэктарка СШ №162.

**Шабаноўская акруга №3**

**Арцюхоў** Мікалай, 1979, беспрацоўны. **Савіч** Гелена, 1956, намесьніца галоўнага лекара 36-й паліклінікі. **Ціткоў** Васіль, 1956, дырэктар «Прававога агенцтва «Прэзумпцыя-94». **Шышпаронак** Валеры, 1962, начальнік гарадзкога аддзяленьня міліцыі №1 УУС адміністрацыі Заводзкага раёну.

**Галадзедаўская акруга №4**

**Адзінцова** Антаніна, 1955, старшая выкладчыца Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту. КПБ. **Бачароў** Дзьмітры, 1970, дырэктар СШ №143. **Воблава** Людміла, 1957, намесьніца старшыні прафкаму Менскага аўтамабільнага заводу. **Каралёва** Сьвятлана, 1963, старшыня каардынацыйнае рады Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Жаночы адказ». АГП. **Шашко** Натальля, 1969. Хатняя гаспадыня.

**Ташкенцкая акруга №5**

**Ажгірэй** Аляксандар, 1946, намесьнік дырэктара МАЗу па сумесных праектах. **Вераб'ёў** Уладзімер, 1945, начальнік Камандна-інжынэрнага інстытуту Міністэрства па надзвычайных сытуацыях. **Суворава** Галіна, 1960, інжынэр-канструктар ААТ «Вопытны мэханічны завод «Агратэхмаш». ЛДП. **Янукевіч** Аляксей, 1976, выкладчык Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэю імя Я.Коласа. БНФ.

**Аўтазаводзкая акруга №6**

**Буткевіч** Сяргей, 1943, майстар МАЗу. **Лучыновіч** Валеры, 1961, інжынэр-тэхноляг МТЗ. БНФ. **Пашкевіч** Леанід, 1943, дырэктар Менскага дзяржаўнага аўтамэханічнага каледжу. **Тутубалін** Аляксей, 1963, намесьнік генэральнага дырэктара МАЗу.

**Васьняцоўская акруга №7**

**Аксёнаў** Сяргей, 1963, кіраўнік магазыну ІП Кірылюк Т. **Лабада** Ігар, 1952. Часова не працуе. АГП. **Паўловіч** Анатоль, 1953, галоўны тэхноляг — начальнік аддзелу Менскага падшыпнікавага заводу. **Паляшчук** Ірына, 1948, загадчыца катэдры Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту.

**Убарэвіцкая акруга №8**

**Вялічка** Пётра, 1963, дырэктар ЖЭС №32» жыльлёвага рамонтна-эксплуатацыйнага аб'яднаньня Заводзкага раёну. **Галабурда** Ўладзімер, 1966, фінансавы дырэктар ТАА «Стронікс».

## Хлебнікі на могілках

**За апошнія гады жыхары раёну прызвычаіліся набываць танны хлеб у прыватных хлебапёкаў са Смаленшчыны.** Незадаволены былі адно работнікі мясцовага хлебазаводу, прыбытак якога паменеў. На абарону мясцовага вытворцы і бюджэту ўзьняліся ўлады, работнікі санэпідэмстанцыі і міліцыянты. Апошнім часам расейцы гандлявалі сваёй прадукцыяй на гарадзкіх могілках. Канчаткова падарваў хлебны бізнэс суседзяў урад, які пастанавіў зьменшыць цану на муку для хлебазаводаў памежных з Расеяй раёнаў. Цяпер гандляры расейскім хлебам, абмінаючы Крычаўшчыну, едуць у Чэрыкаўскі, Краснапольскі ды іншыя раёны.

**Андрэй Кузьмін, Крычаў**

## «Дзядзька Несцер»

**31 студзеня пабачыў сьвет першы нумар горацкай грамадзкай газэты «Дзядзька Несцер».** Газэта зьмяшчае мясцовыя і рэспубліканскія навіны. Набыць газэту можна ў распаўсюдніка на гарадзкім кірмашы.

**Ільля Заранок, Горкі**

## Абвалілася столь

**У адным з дамоў даваеннай пабудовы ў Бялынічах абвалілася столь.** У хаце знаходзіліся двое дзяцей і мужчына. Дзеці паспелі выбегчы на вуліцу, а вось мужчына апынуўся пад завалам. Ягонае жыцьцё ўратавала мэбля. Адмыслоўцы мясцовага аддзелу МНС вызвалілі чалавека і даставілі яго ў райбольніцу.

## Да лісіц далучыўся янот

**Летась на тэрыторыі раёну было зарэгістравана 19 выпадкаў шаленства лісіц.** За першы месяц новага году становішча не палепшылася: хвароба выяўлена ў дзьвюх лісіц і янота. Небясьпечнымі па шаленстве дзікай жывёлы прызнаныя тэрыторыі вёскі Сурды, урочышчаў «Ермалавічы» і «Межанец», а таксама вул.Заслонава ў Бялынічах. Тут будуць праведзены каранцінныя мерапрыемствы.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

## «Ільняныя» табурэты

**Чавускі льнозавод у студзені гэтага году пачаў выраб табурэтаў.** Яны робяцца з сасны і пакрываюцца лакам. У залежнасьці ад попыту прадпрыемства пляну е выпускаць 600—800 штук у месяц. Прыблізная цана аднаго табурэта не перавышае 6 тыс. рублёў. Рэалізацыя новай прадукцыі ажыцьцяўляецца на ўнутраным рынку і ў Расеі.

**Катарына Іванова, Магілёў**

## Чорныя бярозы

**Івацэвіцкі райвыканкам надаў статус батанічнага помніка прыроды мясцовага значэньня 11-гектарнаму лясному масіву ў Калінінскім лясьніцтве.** Назвалі новую ахоўную зону «Турнянскія чорныя бярозы». 220 рэдкіх дрэваў, якія там растуць, адрозьніваюцца ад звычайных бяроз колерам кары. Ствалы ў іх цёмныя і буравата-шэрыя ды крона крыху сьціснутая. Чорныя бярозы сустракаюцца рэдка, але паблізу вёскі Турная яны разрасьліся — вельмі шмат маладых дрэўцаў. Гэта самая вялікая сям'я дрэў такой пароды ня толькі ў нас у Беларусі, але і ва ўсёй Усходняй Эўропе.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

## Тайнік у аўтамабілі

**20-гадовы жыхар Вільні наведваўся ў нашу краіну ня толькі для таго, каб пабачыцца з роднымі ці паглядзець на беларускія краявіды.** Быў у яго і камэрцыйны інтарэс, што грунтаваўся на істотнай розьніцы цэнаў на бэнзын у нашых краінах. Ён зрабіў у сваім аўтамабілі «Міцубісі-Галант» тайнік: пераабсталяваў газавы балён і залідаў туды, кіруючыся дамоў, 55 літраў бэнзыну. У пункце пропуску «Лоша» аўтамабіль быў арыштаваны і перададзены ў Ашмянскую мытню для разьбіральніцтва.

## Гераін у сьметніцы

**У цягніку №149 «Масква—Калініград» на станцыі Гудагай памежнікі знайшлі гераін.** Схаваны ён быў у сьметніцы ў поліэтыленавых пакетах. Гаспадара амаль трох кілаграмаў гэтага наркотыку знайсьці не ўдалося. Праваахоўныя органы ўзбудзілі крымінальную справу.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

## Сьвятла няма

**У вёсцы Студзёнкі, што на Барысаўшчыне, цалкам адсутнічае вулічнае асьвятленьне, бо сельсавет ня мае грошай плаціць за электрычнасьць.** На наступнай сэсіі райсавету гэтае пытаньне будзе разгледжана, а пакуль вёска вечарамі патанае ў цемры.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

## Złavili vymahalnika

**Z vul.Savieckaj 16 studzienia źnikła Aŭdzi-100.** Złodziej praz peŭny čas źviazaŭsia z haspadarom mašyny j zapatrabavaŭ za viartańnie 2200 dalaraŭ. Adnak milicyjanty chutčej zatrymali vymahalnika, čym jon pabačyŭ tyja «zialonyja». Heta 40-hadovy žychar horadu, jaho raniej užo sudzili za chulihanstva. Padčas zatrymańnia ŭ złodzieja znajšli pistalet Makarava.

## Rtuć ciače na hałovy

**U Baranavičach haspadar kvatery pa vul.Bierasciejskaj, jaki žyvie na pieršym paviersie, zaŭvažyŭ, jak pa radyjatarnaj trubie źvierchu ciače rtuć.** Vyklikanyja supracoŭniki MNS uźniali padłohu kvatery vyšej i vyjavili 30 hr. taje atruty. U kvatery na pieršym paviersie sabrali jašče 10 hr. Žycharoŭ abiedźviuch kvateraŭ vysielili, a žytło apracavali chłornym žalezam. Na nastupny dzień pary rtuci vyjavili ŭ kvatery na trecim paviersie. Nichto z žycharoŭ nia viedaje, adkul u ich źjaviłasia rtuć.

## Daktary źmianili maršruty

**Dziela narmalnaj pracy tamohrafa, jaki vykarystoŭvajecca ŭ Baranavickaj haradzkoj paliklinicy, źmienienyja maršruty troch haradzkich aŭtobusaŭ.** Ciapier №1, 3, 13 kursujuć nie pa vul.Horkaha, što kala paliklinik i, a za 2 kvartaly dalej — pa vul.Kamsamolskaj. Vibracyja ziamli ad ciažkich aŭtamabilaŭ skažala pakazańni tamohrafa.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**



IREX-PROMEDIA

**На Валожыншчыне, у Налібоцкай пушчы, палююць на ваўкоў. З чатырох драпежнікаў адзін быў забіты паляўнічымі.**

# Вялейская кааліцыя

**Вялейка пераўзыходзіць сярэдні па Беларусі паказьнік колькасьці кандыдатаў на месца ў савеце дэпутатаў — 1,32 (супраць 1,11 па Рэспубліцы). 12 кандыдатаў належаць да палітычных партыяў. 4 лютага дзесяць зь іх (сябры АГП, БНФ і ПКБ) дамовіліся ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі разам. Фармальных апанэнтаў яднае жаданьне перамагчы, яны нават склалі агульную дэкларацыю — праграму сваёй дзейнасьці ў райсавеце. Мэты збольшага непалітычныя. Палітычныя разьбежнасьці перадаоленыя, абы ў райсавет прарваўся хоць нехта ад апазыцыі.**

З 53 вялейскіх кандыдатаў толькі адзін прыватны прадпрымальнік, затое два беспрацоўныя.



**Уладзімер Малярчук, 55 гадоў, сябра АГП з 1994 г., старшыня вялейскай раённай суполкі АГП, працуе ў Вялейскай райаграпрамтэхніцы.**



**Сяргей Клімёнак, 27 гадоў, настаўнік фізкультуры Вялейскай спэцшколы-інтэрнату, сябар АГП з 2002 г.**



**Аляксей Сюдак, 22 гады, старшыня вялейскай суполкі БНФ, працуе настаўнікам у вёсках Хадасы й Любань.**



**Аляксандар Сыракваш, 42 гады, сябра БНФ, працуе прэсаўшчыком на «Зэніце», старшыня пярвічкі СПБ заводу.**

**«НН»: Спадарства, які расклад сілаў паміж вашымі партыямі?**

**Уладзімер Малярчук:** У Вялейскім райсавеце 40 месцаў (19 акругаў па горадзе і 21 па раёне). Па горадзе ідуць 10 чалавек ад партый (сем ад АГП, ад БНФ двое і адзін ад ПКБ), і ўсе маюць па адным апанэнту. У прадстаўніка ПКБ два канкурэнты — дырэктары гарадзкіх электрасетак і дрэваапрацоўчага камбіната.

**«НН»: Чым будзеце прывабліваць людзей: можа, маеце нейкія адмысловыя сродкі агітацыі?**

**У.М.:** У нас усіх прыкладна аднолькавая колькасьць выбаршчыкаў — каля 1100 чалавек. Паводле нашых падлікаў, за кандыдата, каб ён перамог, павінна быць пададзена каля 400 галасоў. Кожны з нас плянуе абысьці ўсіх сваіх выбарцаў і асабіста запрасіць на галасаваньне. Нават не агітаваць актыўна за сябе: даць улётку, пагаварыць па-чалавечы.

**Сяргей Клімёнак:** Каб жыхары раёну ведалі, што галасуюць не за ката ў мяху. На працы некалькі канчын пачулі, што я балятуюся, — і адразу да мяне: дзе гэта будзе, куды прыйсьці, каб за цябе прагаласаваць.

**«НН»: Якія асноўныя вашыя мэты?**

**Аляксандар Сыракваш:** Мы, 10 кандыдатаў, выступаем за тое, каб райвыканкам рабіў справаздачу перад грамадзянамі. Зьбіраемся, калі пераможам, кантраляваць сродкі, якія ідуць на сацыяльную абарону грамадзян.

**С.К.:** Хочам надаваць увагу фінансаваньню дзіцячых садкоў, школ, бальніц. Будзем садзейнічаць вырашэньню маладзёвых праблем. Мы, калі пройдзем у савет, паставім па горадзе некалькі стэндаў для самвыдавецкае газэты. У ёй будзем пісаць пра паседжаньні райсавету, аб тым, што канкрэтна робіць той ці іншы дэпутат.

**Аляксей Сюдак:** Жадаем спрыяць развіцьцю прыватнага бізнэсу, павелічэньню вытворчага патэнцыялу нашых прадпрымальнікаў. Таксама добра б было спрасьціць працэдуру арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасьці, узьняць пытаньне аб зьмяншэньні падаткаў.

**Гутарыў Аляксей Чубат**

# «Мой ідэал – моцная ўлада»

**Нацыяналісты сёньня не сядзяць у лясох, як у 50-я, і не расьпісваюць сьценаў, як у 90-я. Яны спрабуюць свае сілы ў барацьбе за ўладу. І хоць улада гэтая ў выглядзе мясцовых саветаў ня мае сёньня значных паўнамоцтваў, нацыяналісты бяруць удзел у выбарах. У менскі гарсавет па Шугаеўскай выбарчай акрузе ва Ўруччы балятуецца сябра незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды Юрась Данілаў. Мы сядзім зь ім за гарбатай, а з дынаміка гучыць ягонае выступленьне на радыё «Сталіца». Ён гаворыць пра пагрозу, якую нясуць беларускай незалежнасьці расейская бюракратыя ды алігархі.**

**«НН»: Чаму Вы наважыліся ўзяць удзел у выбарчай кампаніі?**

**Ю.Д.:** Я меркаваў так: палітычна мы ўсё робім правільна, але з галавы не выходзілі словы з Бібліі пра тое, што «ўся ўлада ад Бога». І гэтая думка не давала мне спакою: ці я дрэнны хрысьціянін, ці я дрэнны нацыяналіст? І калі пайшла размова пра ўдзел у выбарах, я не вагаўся. Пасьля абароны Курапатаў у нас ёсьць нейкі ўздым. Мы ведаем, што можам нешта рабіць, можам перамагаць.

Пра сваіх выбарцаў я кажу: «мае суседзі». Бо гэта так і ёсьць: ці дом суседні, ці квартал. Найперш у мяне пыталіся пра праграму, сур'ёзна слухалі. Я ўсім казаў, што я — нацыяналіст. Расказваў пра тое, што рабіла наша арганізацыя. Яны ж амаль нічога ня ведаюць пра нацыянальны рух, не чытаюць апазыцыйнай прэсы, праўда, нешта чулі пра Курапаты. Людзі арыентуюцца на БТ, АНТ, некаторыя і пра выбары ня ведалі…

За той час, што я хадзіў па кватэрах і сустракаўся зь людзьмі, зрабіў выснову: шараговыя нашыя грамадзяне — большыя нацыяналісты, чым апазыцыйныя палітыкі. Праўда, прыкра чуць, што менчукі ведаюць палітыкаў Нямцова, Жырыноўскага, Шандыбіна, а беларускіх — не. Я пытаюся: «А хто ў нас прэм'ер-міністар?». Яны ж ведаюць толькі Лукашэнку, для іх існуе толькі адзін беларускі палітык.

**«НН»: А не бянтэжыць, што сярод нацыяналістаў няма адзінства? Зянон Пазьняк заклікае ня браць удзелу ў выбарах…**

**Ю.Д.:** Зянона Пазьняка я паважаю, ён пачынальнік нацыянальнага руху. Але цяпер спадар Зянон жыве ў іншай краіне, і даваць адтуль нейкія загады, мне падаецца, стратэгічна няправільна.

**«НН»: Ці дапускаеце Вы сёньня магчымасьць супрацы нацыянальных сілаў з уладай, калі гэта трэба для дабра Беларусі?**

**Ю.Д.:** Я не ўяўляю, што заўтра ў БПС патэлефануе чыноўнік з выканкаму і прапануе разам папрацаваць на карысьць Бацькаўшчыны. Была ў мяне калісьці прапанова арганізаваць добраахвотныя народныя дружыны, але хто ж нам гэта давярыць?! А мы ж нічога ня маем супраць міліцыі. Правая партыя ня можа быць супраць улады як такой, ідэал правых — гэта й ёсьць улада, моцная ўлада.

Але ня пойдзе ўлада на тое, каб з намі рабіць нейкія праекты. Па-першае, яны нас не паважаюць, ня бачаць у нас сілы. Калі ж я здолею прайсьці ў гарадзкі савет, там да мяне павінны будуць прыслухоўвацца.

**«НН»: Ці БПС думае пра легалізацыю?**

**Ю.Д.:** Тое, што я балятуюся ў дэпутаты, — гэта адказ на пытаньне.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Юрасю Данілаву 28 гадоў. Ён нарадзіўся ў Койданаве, вучыўся ў Менску. У 1996 г. скончыў Балтыйскую марскую акадэмію ў Калінінградзе па спэцыяльнасьці інжынэр-мэханік. Не знайшоўшы сталай працы, вярнуўся ў Беларусь і асвоіў прафэсію мастака-дызайнэра. Ён займаецца вонкавай рэклямай (у прыватнасьці, афармляў рэстаран-дыскатэку «Тунэль» у Менску), у вольны час захапляецца кампутарным дызайнам, вывучае Біблію і стараецца жыць паводле яе канонаў. Жанаты, сыну 8 гадоў. Сябра незарэгістраванай Беларускай партыі свабоды. З чатырох партыйных кандыдатаў ён адзіны працягвае барацьбу за дэпутацкі мандат. Дырэктарка малочнай кухні «Татошка» Таіса Пужэвіч будзе ягонай суперніцай.**

## Беларускі сьцяг над Нарвэскім морам

**Расказвае Юрась Данілаў:** «У сярэдзіне 90-х я служыў на расейскім рыбалоўным караблі ў Нарвэскім моры. У мяне была начная вахта, і я вырашыў павесіць беларускі сьцяг на флагштоку. Я тады яшчэ ня ведаў, што караблі ў моры ня ходзяць пад сьцягамі, а падымаюць іх, калі заходзяць у акваторыю порту… Павесіў сьцяг. Гэта была запамінальная карціна: мора, чорнае неба зь бязьліччу зорак і падсьвечаны пражэктарам белчырвона-белы сьцяг. Потым я атрымаў вымову ад капітана. А калі ён закрычаў, каб я зьняў «гэтую анучу», каманда паабяцала яму бунт. Нібыта жартам. Бо з 26 чалавек экіпажу было 19 беларусаў».


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Сход стане пачаткам арганізацыі

**Усебеларускі сход інтэлігенцыі, які мае адбыцца 16 сакавіка, выклікаў супраціў уладаў. У многіх раёнах перашкаджаюць вылучэньню дэлегатаў: адмаўляюцца даць памяшканьне (у Івацэвіцкім раёне сход давялося ладзіць проста на вуліцы), запалохваюць магчымых удзельнікаў (так «папярэджвалі» настаўнікаў у Дзятлаве і Навагрудку). Што хочуць супрацьставіць гэтаму ўціску арганізатары? Ці ня стане сход інтэлігенцыі чарговым «пратакольным зборам» апазыцыі? Уладзімер Колас, пэдагог і кінарэжысэр, адзін з сустаршыняў аргкамітэту па скліканьні Ўсебеларускага сходу інтэлігенцыі, адказвае на пытаньні «НН».**

**«НН»: Што ўжо зрабіў аргкамітэт?**

**У.К.:** Адбылося вылучэньне дэлегатаў ад Менску. Абраныя дэлегаты падзелены на сэкцыі, у якіх ідзе праца. Там выпрацоўваюцца тэзысы выступаў і адбываецца вылучэньне тых, хто будзе агучваць гэтыя даклады.

З рэгіёнаў ідуць пратаколы, але вылучэньне адбываецца стыхійна і без захаваньня пэўнай працэдуры. Галоўнае, каб вылучэньне адбывалася не ад партыі, арганізацыі ці нейкай установы, а на агульных сходах. І мы прапануем кандыдатуры тых, хто вылучыўся па сьпісах ад установы ці арганізацыі, разглядаць і зацьвярджаць на мясцовым ці абласным сходзе інтэлігенцыі.

**«НН»: Ці ня стане сход зборам апазыцыйнай інтэлігенцыі?**

**У.К.:** Мы хочам, каб сход быў як мага больш прадстаўнічым і значным. Справа кожнага — прыняць нашае запрашэньне ці адмовіцца. На жаль, і сёньня ініцыятыва зьнізу вельмі часта разглядаецца цяперашнімі ўладамі (як і папярэднімі, камуністычнымі) з падазронасьцю. Таму частка нашай інтэлігенцыі, якая ўзаемадзейнічае з уладай, традыцыйна пабойваецца такую ініцыятыву праяўляць. Ужо быў выпадак, калі вядомы чалавек спачатку паставіў подпіс у падтрымку сходу, а потым казаў, што не зусім разумеў, пад чым.

Мы запрашаем усіх інтэлігентаў, у тым ліку прадстаўнікоў улады, калі яны лічаць сябе інтэлігентамі, прыйсьці на наш сход і паразмаўляць. Адгукаюцца па-рознаму. Напрыклад, на наш гарадзкі сход з дэпутацкай фракцыі «Рэспубліка» палаты прадстаўнікоў прыйшлі ўсе, хто на той момант быў у Менску. Лісты з запрашэньнем прыняць удзел у нашым Усебеларускім сходзе ў якасьці гасьцей мы даслалі старшыням палатаў парлямэнту і кіраўніку Адміністрацыі прэзыдэнта Ўралу Латыпаву. Будуць дасланыя такія запрашэньні і міністрам (у тыя міністэрствы, якія закранаюць сфэру нашай дзейнасьці), рэктарам ВНУ (як дзяржаўных, так і недзяржаўных), запрасілі мы і ўсіх старшыняў творчых саюзаў... І гэта справа іхняй грамадзянскай пазыцыі — прыняць гэтыя запрашэньні ці адседзецца ў кустах.

**«НН»: Якім мусіць быць вынік сходу?**

**У.К.:** Большасьць удзельнікаў аргкамітэту мяркуе, што сход павінен быць не аднаразовай акцыяй, а стаць пачаткам арганізацыі, якая будзе яднаць інтэлігенцыю.

**«НН»: Ці існуюць падобныя арганізацыі інтэлігенцыі ў іншых дзяржавах, асабліва — у суседніх з намі Польшчы, Украіне, Літве?..**

**У.К.:** Гэтае пытаньне нас таксама зацікавіла, і мы зьвярнуліся ў пасольствы. Ужо адказала ўкраінскае пасольства, якое выведзе на такія кантакты. Вельмі добры адказ прыйшоў з польскага пасольства: нам далі каардынаты ПЭН-цэнтру і шматлікіх арганізацыяў, якія там называюцца «клюбамі каталіцкай інтэлігенцыі», і прапанавалі свае пасярэдніцтва ў наладжваньні кантактаў. Безумоўна, мы мяркуем запрасіць удзельнікаў гэтых арганізацыяў на наш сход.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**

• КЛЯСЫЧНАЯ МУЗЫКА •

# Гастролі Янішэўскіх

**5 лютага, у апошні тыдзень зімовых канікулаў, у пустым і змрочным вэстыбюлі Беларускай акадэміі музыкі завіравала жыццё. Нагодаю для гэтага сталася канцэртная імпрэза з удзелам маладых польскіх сьпевакоў Яцэка Янішэўскага і Ганны Мілеўскай-Янішэўскай, зладжаная Польскім інстытутам. Утульная заля Акадэміі музыкі, разьлічаная на паўтысячы слухачоў, запоўнілася амаль цалкам без аніякай рэклямы і продажу квіткоў. Выдатна спрацаваў наш «народны тэлеграф» — «з вуснаў у вусны». Нават у эпоху Інтэрнэту ён застаецца для менчукоў галоўным сродкам масавай інфармацыі.**

Працаўнікі й студэнты Акадэміі гэтую імпрэзу праігнаравалі. Апрача прафэсара Роўды, кампазытара Лыбіна і трох-чатырох канцэртмайстарак з вакальных клясаў не было відаць аніводнага прафэсіянала. Залю запоўнілі аматары — тыя, хто занудзіўся па яскравых музычных уражаньнях, бо Канцэртная заля Беларускай філярмоніі зачыненая з тае вясны. Муж і жонка Янішэўскія сьпявалі для мноства ўважлівых вушэй.

Іхны першы выступ у Менску адбыўся гадоў сем таму ў касьцёле Сьв.Роха. Уражаньне засталося пекнае, аднак касьцёл на Залатой Горцы — не найлепшае месца для камэрных канцэртаў. У ягоных акустычных умовах гучаньне галасоў скажаецца, дэталі выкананьня губляюцца. Заля Акадэміі музыкі ў гэтым сэнсе прыдатнейшая, але й значна большага патрабуе. Нездарма тут адбываюцца экзамены па ўсіх музычных спэцыяльнасьцях. У гэтай залі трэба сьпяваць у поўны голас, спадзеючыся толькі на свае сілы і талент, бо акустыка, антураж, асьвятленьне, суровая акадэмічная атмасфэра — усё працуе супраць артыста.

Сем гадоў таму Янішэўскія сьпявалі песьні Шубэрта. Цяперака ў першым аддзяленьні былі выкананыя шэдэўры нямецкага рамантызму — асобныя песьні з вакальнага цыклу Робэрта Шумана на вершы Генрыха Гайнэ «Каханьне паэта» (сьпяваў Яцэк Янішэўскі) і вакальны цыкл Рыхарда Вагнэра «Пяць вершаў Матыльды Вэзэндонк» (сьпявала Ганна Мілеўская-Янішэўская). За раялем была канцэртмайстарка БАМ Ала Трафімава.

Урыўкі з «Каханьня паэта» прагучалі амаль дасканала. Мяккі, прыгожа афарбаваны бас Яцэка Янішэўскага выявіўся дастаткова гнуткім. За мінулыя ад першага прыезду гады сьпявак выйграў конкурс імя Манюшкі ў Варшаве і славуты венскі вакальны конкурс «Бэльвэдэр», трапіў у фінал конкурсу імя Пляcыда Дамінга ў Токіё, сьпяваў на опэрных сцэнах Нямеччыны і іншых краінаў Эўропы, стаўся салістам Нацыянальнай опэры ў Варшаве... У сьвеце цяпер вялікі попыт на галасы, прыдатныя для камэрных сьпеваў і барочнай опэры.

Янішэўскі добра выглядае на сцэне, паводзіцца жыва і вызначаецца непадробнай прыроднай музычнасьцю. Ён сьпявае сэрцам і не шкадуе намаганьняў, каб данесьці сваю задуму да публікі. Чаго ня скажаш пра ягоную жонку. У «Пяці вершах Матыльды Вэзэндонк» яна была цалкам бездапаможнай. І справа ня толькі ў тым, што ейнага сьціплага, амаль бясгэмбравага, «ляльечнага» мэца-сапрана не ставала для драматычных Вагнэравых песень. Не ставала найперш разуменьня музыкі, пранікненьня ў ейныя эмацыйныя глыбіні. Дый адкуль чакаць глыбокіх думак і пачуцьцяў, калі сьпявачка ўвесь час глядзела ў ноты?

У другім аддзяленьні, дзе гучала польская й беларуская музыка XIX—XX ст., спадарыня Янішэўская сьпявала значна лепей. Асабліва ўдалася ёй песьня «Пад яварам» у апрацоўцы нашага земляка Мячыслава Карловіча. Яцэк Янішэўскі сьпяваў бліскуча. Ён адкрыў нам сапраўдную прыгажосьць песень Манюшкі. Ня кажучы ўжо пра невядомыя беларускаму слухачу песьні Фрэдэрыка Шапэна, Мячыслава Карловіча й Ігната Падэрэўскага.

Яшчэ ў гэты свой прыезд Яцэк Янішэўскі з посьпехам паўдзельнічаў у спэктаклі Беларускае опэры «Князь Ігар», выступіўшы ў ролі Канчака. І хоць беларускія калегі ўспрынялі ягоную манеру сьпеву ў штыхі, гэткае супрацоўніцтва было карысным для абодвух бакоў. Аднак найболей выйграла ад гэтага нашая публіка, якую апошнім часам трымаюць на галодным пайку. Пакуль яна рэагуе нармальна — просіць духоўнае ежы. Але гэтую цікаўнасьць да духоўнага варта неяк стымуляваць.



**Янішэўскі сьпявае сэрцам і не шкадуе намаганьняў, каб данесьці сваю задуму да публікі.**

**Юлія Андрэева**

• У ВІЛЬНІ •

# Паўтара стагодзьдзя літоўскай фатаграфіі

**У мінулы чацьвер у будынку Віленскай ратушы было сьвята. Тут прэзэнтавалі салідны альбом — «Літоўская фатаграфія да XXI стагодзьдзя». Гэта вялікая і доўгачаканая падзея для краіны, дзе існуе культ фотамастацтва. Дзе ў падручніках па мастацтвазнаўстве нават ёсьць артыкулы, прысьвечаныя творчасьці літоўскіх фатографаў. А ў Віленскай мастацкай акадэміі чытаецца асобны курс — фатаграфія.**



**Невядомы аўтар. Пачатак XX ст.**



**Аўтар — Рамуальдас Пажэркіс. 1970-я.**

Школа літоўскай фатаграфіі — унікальная зьява, і літоўцы моцна ўзяліся за яе сьцьвярджэньне. Прыкладам таму — тры фотагалерэі ў найлепшых пунктах Вільні, штомесячны часопіс «Vaizdas» (Від) і вялізны штогадовік Саюзу фотамастакоў «Lietuvos fotografija: vakar ir siandien» (Літоўская фатаграфія: учора і сёньня). А што казаць пра аўтарскія фотаальбомы і каталёгі, якія выходзяць адзін за адным навыперадкі! Папросту бракуе грошай, каб гэта ўсё набываць.

Літоўская фатаграфія зьявілася тады ж, калі Парыж заявіў аб тым, што можа захаваць выяву на срэбранай пласьцінцы. У тыя часы фатаграфія была цесна зьвязана з тэхнікай і хіміяй. Таму першыя здымкі, як працы альхіміка — маюць у сабе водблiск цуду...

Гартаючы старонкі альбому «Літоўская фатаграфія да XXI стагодзьдзя», можна сачыць за гісторыяй Літвы, бачыць, як мяняліся традыцыі й тэмы. Сымбалічна, што зьяўленьне гэтага фаліянту адбылося ў год, калі Саюз фотамастакоў Літвы сьвяткуе 70-ю гадавіну.

Складальнік альбому Станіславас Жвіргждас сам прызнаны фатограф, ён цягам некалькіх гадоў узначальваў Саюз фотамастакоў. С.Жвіргждасу давялося перагледзець тысячы дагератыпаў, амбратыпаў і першых фатаздымкаў, ня кажучы пра сучасныя. З адабранай тысячы ён адкідаў і адкідаў па адным... Жвіргждас падкрэсьліў, што ў альбом увайшло толькі самае, на яго думку, прыгожае, што ёсьць у літоўскім фотамастацтве ад 1842 г., якім датуецца першы зьмешчаны дагератып, і да нашых часоў. З найбольш значных аўтараў — Корзан, Флеры, Чурлёніс. Пачатак XX ст., вядома ж, прадстаўлены Булгакам. Тут мноства здымкаў і аўтараў, якія публікуюцца ўпершыню, але большасьць складаюць вядомыя і прызнаныя.

Выйшаў фаліянт у выдавецтве Раймондаса Пакніса. Ідэя стварыць такую кнігу там зьявілася яшчэ пяць гадоў таму. Р.Пакніс зрабіў першую спробу выдаць альбом разам з Фотасаюзам, але апошні меў свае пляны на іншае выданьне. Мо гэта пайшло на карысьць, бо ў выніку кніга рыхтавалася і шліфавалася бязь сьпешкі. Яна выйшла якраз да дзесяцігодзьдзя з дня заснаваньня выдавецтва — такая сабе радасьць невялічкага калектыву. Р.Пакніс адзначыў, што «Літоўская фатаграфія» выдадзеная ня дзеля прыбытку, бо ў Літве нават на самых шыкоўных фотаальбомах яшчэ ніхто не зарабляў. Паліграфію прафінансаваў Дабрачынны фонд дапамогі Саўлюса Каросаса. Музэі й бібліятэкі, а таксама жывыя аўтары, чые здымкі трапілі ў выданьне, працавалі без ганарараў.

Фаліянт важыць амаль тры кілё і надрукаваны вельмі малым накладам — 550 асобнікаў. Добра, што нават «чорна-белыя» здымкі надрукаваныя ў поўны колер, каб перадаць усе адценьні, якія на іх нанёс час.

Альбом ужо атрымаў першую ўзнагароду на літоўскім штогадовым конкурсе «Мастацтва кнігі».

**Дзяніс Раманюк**

# Беларусы крочаць у сусьветную эліту

7—9 лютага беларускія аматары вялікага тэнісу мелі магчымасьць назіраць за гульнёй на корце спартоўцаў сусьветнага ўзроўню. Сталіца прымала матч Кубку Дэвіса Беларусь—Ізраіль. Наша краіна выступае ў гэтым прэстыжным турніры ад 1994 г., а з 1999-га беларусы змагаюцца ў 1-й групе Эўра-Афрыканскай зоны за выхад у сусьветную групу. Але ў папярэднія гады беларусы прайгравалі матчы кваліфікацыйнага кола: у 2000 г. — швайцарцам, а ў 2001 — аргентынцам. Летась, саступіўшы стартавы матч камандзе Зымбабвэ зь лікам 1:4, нашыя хлопцы адолелі партугальцаў зь лікам 4:1 і адстаялі пазыцыю зборнай у 1-й групе. І вось сёлета ў нас ізноў зьявілася магчымасьць трапіць туды, дзе 16 самых моцных камандаў змагаюцца за галоўны трафэй. Напярэдадні матчу, пераглядаючы стартавыя пратаколы, можна было заўважыць, што ў рэйтынгу ATP Tour двое з нашых тэнісістаў выглядаюць больш сур’ёзна за сваіх супернікаў. Беларусь прадстаўлялі: Максім Мірны (№45 — адзіночны, №3 — парны), Уладзімер Ваўчкоў (№77 — адз., №99 — п.), Аляксандар Швец (№678 — адз., №745 — п.), Аляксандар Скрыпко (2 балы ў ATP Tour) і Сяргей Цяцерын (капітан каманды). Ізраільцяне накіравалі ў Менск Наома Окуна (№129 — адз., №612 — п.), Харэла Леві (№246 — адз., №290 — п.), Джонатана Эрліха (№446 — адз., №129 — п.), Андзі Рэма (№1332 — адз., №379 — п.) і Амаса Мансдорфа (капітан каманды).

Ізраільцяне рабілі стаўку ў першую чаргу на парную сустрэчу, дзе з боку гасьцей выступалі Джонатан Эрліх і Андзі Рэм — дасьведчаны і згуляны дуэт. Аднак першымі на корт выйшлі адзіночнікі. Макс Мірны перамог Харэла Леві — 6:1, 6:7, 6:3, 7:6, потым Уладзімер Ваўчкоў у трох сэтах «разабраўся» з Наомам Окунам — 6:2, 7:6, 6:3. На другі дзень да сеткі выйшлі пары Мірны/Ваўчкоў — Эрліх/Рам. Для гасьцей гэта была апошняя магчымасьць «зачапіцца» за гульню, таму сустрэча атрымалася дынамічнай і цікавай, ды ўсіх ахвотных panaзіраць за баталіямі на корце палац тэнісу папросту ня змог пранняць. Гледзячы на гульню Мірнага, можна было яшчэ раз пераканацца, што мянушку «Зьвер» далі яму невыпадкова. І хоць нават сьляпому было відаць, што Макс па сваёй гульнёвай клясе на галаву вышэй за супернікаў, змагаўся ён з поўнай аддачай. Падавалася, што Максу мала месца на корце — такімі магутнымі і рашучымі былі ягоныя ўдары. Мірны «даставаў» самыя складаныя мячы — нават па-за межамі корту. Ваўчкоў падтрымаў свайго кампаньёна годнай гульнёю, і як вынік — перамога ў сустрэчы 7:6, 6:4, 6:4, і нашая каманда датэрмінова выйграла матч 3:0. Таму ў трэці дзень кіраўніцтва зборнай дазволіла выступіць слабейшым гульцам, двум Аляксандрам — Скрыпко і Шаўцу. Каб назапашвалі досьвед выступленьня на буйных міжнародных турнірах. Абодва прайгралі свае сустрэчы Наому Окуну і Харэлу Леві. Швец зьняўся ў другім сэце праз траўму пляча, а 17-гадоваму Скрыпко папросту не хапіла звычкі перамагаць. Аднак у гульні ягонай быў бачны высокі патэнцыял і імкненьне стаць годнай заменай Мірнаму і Ваўчкову. Окун жа, якому Скрыпко прайграў, у пэўнай ступені таксама «наш»: ягоная маці паходзіць з Бабруйску.



**Мірны «даставаў» самыя складаныя мячы, а Ваўчкоў падтрымаў свайго кампаньёна годнай гульнёю.**

Цягам усіх трох дзён трыбуны, як маглі, падтрымлівалі беларускіх тэнісістаў: балельшчыкі прынесьлі маракасы, дудкі, бубны, а крыкі «Вовачка, давай!» і «Жыве Беларусь!» маглі расчуліць самую неспартовую душу. Аднак нават ізраільцяне адзначылі, што ў цэлым гледачы былі карэктнымі і да іх няма ніякіх прэтэнзіяў. Адзінае, на што скардзіліся спартоўцы абедзьвюх камандаў, — званкі мабільных тэлефонаў. Хоць дыктарка неадночы прасіла адключыць гукавы сыгнал, цьвірканьне і трынканьне чуліся з трыбунаў кожныя хвілін дзесяць, што біла нават па самых моцных нэрвах.

Свой наступны матч на выхад у сусьветную групу беларусам давядзецца згуляць з камандай Зымбабвэ. Пакуль лік камандных сустрэчаў 1:1. Каму ў залік пойдзе другі бал, стане вядома 4—6 красавіка ў Менску.

**Настасься Марыніна**

# Разборкі інтэлектуалаў

**Гульні Чэмпіянату краіны па «Што? Дзе? Калі?» і «Брэйн-рынгу» адбыліся 8—9 лютага ў Віцебску.**

Падчас іх акрэсьліліся дзьве супярэчнасьці сярод прыхільнікаў інтэлектуальных спаборніцтваў. Па-першае, плынь «старых» інтэлектуалаў змагаецца з маладняком, які прыйшоў у гульню пры канцы 90-х. Новая генэрацыя эрудытаў выйшла з гурткоў «Што? Дзе? Калі?», кіраўнікамі якіх былі вядомыя гульцы, кшталту Леаніда Клімовіча. Сёньня настаўнікі ўсё часцей саступаюць учарашнім вучням. Па-другое, працягваецца вечнае процістаяньне Менску й пэрыфэрыі. Вынік віцебскіх гульняў — часткова і часовая перамога менскай моладзі. Часткова — бо гомельская каманда «Хатні бусел» на апошніх пытаньнях такі вырвала перамогу ў менскай «Хутны». Таксама ў прызэрах крыху больш сталая каманда «Міт» зь Менску. Першынство на турніры па «Брэйн-рынгу», які праходзіў на наступны дзень, аспрэчвалі дзьве студэнцкія каманды, «МІД-2» ды «Яравіт». Чэмпіёнства заваявалі апошнія — студэнты БДУ. У барацьбе за трэцяе месца ветэран інтэлектуальнага руху — «Разумнік» зь Менску — саступіў віцебскай «Дэмэнцыі».

Чэмпіёны вядомыя — але гэтыя вынікі прамежкавыя. Сезон інтэлектуальных гульняў скончаецца аж у траўні, будзе яшчэ шмат турніраў. Праз выходныя ў Менску адбудуцца «Студэнцкія гульні», потым — «Кубак княгіні Вольгі» ў Віцебску, а напрыканцы — «Кубак Палесься» ў Гомелі.

**Павал Сьвярдлоў, Віцебск-Менск**

• ВОДГУКІ •

## У абарону Бабковай

**Рамантычнае апавяданьне Вольгі Бабковай «Крумкач і Франка» было зганенае ў газэце зусім дарэмна.** Калі падыходзіць да літаратурных твораў з такімі меркамі, тады й «Слуцкія ткачыхі» Багдановіча — няварціца, бо на радзівілаўскіх мануфактурах працавалі толькі мужчыны, і ніводнае жанчыны. Тады й горкаўскі «Буравеснік» ня мае каштоўнасьці, бо гагары жывуць на Поўначы, а пінгвіны — на поўдні. Гэта ўдвая няслушна ў дачыненьні да такой пісьменьніцы, як Бабкова. Яна стварыла новы стыль пісаньня пра гісторыю («гісторыя штодзённасьці»). Шкада, што прамаўчалі ў адказ на рэпліку П.Садоўскага актыўныя літаратуразнаўцы. Гэта ж іхная праца — песьціць літаратурныя таленты.

**Раіса Ратабыльская, tut.by**

## Гішпанскі слоўнік

**У «НН» №2, у артыкуле пра спн.Ірыну Шаблоўскую, успамінаецца нехта, хто зрабіў гішпанска-беларускі слоўнік і не жыве ў Менску.** Гэта я! Гэта я не жыву ў Менску і зрабіў той слоўнік — дзьве рэдакцыі — гадоў 14 таму.

Разумны беларус Янка Саламевіч зь «БелСЭ» запусьціў яго ў вытворчасьць. Але потым прыйшла на яго месца нейкая баба, арганізавала дзьве рэцэнзіі: адну — у сп.К.Шэрмана, — рэцэнзія доўгая, але, па сутнасьці, прэтэнзіяў усяго на пяць радкоў. Другую напісаў мой сябар зь цяперашняга МДЛУ, там таксама заўваг кот наплакаў, усё было ў межах звычайных у такой аб’ёмістай працы невялікіх недагляданў, пропускаў, усё лёгка можна было паправіць. Але яны не захацелі выдаваць слоўнік, мо іх яшчэ бянтэжыў мой нізкі сацыяльны статус — селькор — ды малапісьменнасьць — настаўнік сельскай гішпанскай мовы. Тыя тэчкі з слоўнікам туляцца ў мяне ў шафе. На жаль, рукапіс. 23 і 25 тыс. рээстравых словаў адпаведна.

А тады прадчуваў, што яны ня выдадуць, таму ня дужа засмуціўся, мне болей шкада было Беларусі, якая будзе ссаць маскоўскія слоўнікі, а не карыстацца сваімі.

А стольки кніг перачытаў з алоўкам, стольки газэт! Сотні гадзінаў праслухаў гішпанскае радыё з Мадрыду. 18 скрынак картак з цытатамі, цэлая шафка. Трэба некуды дзець, месца займае...

У той час гішпанцы з МДПІЗМ узяліся былі рабіць гішпанска-беларускі слоўнічак на 7000 словаў, я нават частку матэрыялу для іх прагледзаў. Але патрэбен быў ім той слоўнік як сабаку пятая нага — так дагэтуль нічога і няма.

А колькі яны слоўнікаў на замову маскоўцаў панавырабілялі, колькі тэхнічных кніжак пераклалі з расейскай на гішпанскую! Беларускае было ім, ды і застаецца — маргінальным. На замежна-беларускія слоўнікі не было замовы. Срэбрам тут не зьвініць — гэта замова сэрца і душы.

Нашыя беларусы няхітрыя, самаедныя і несалідарныя. Ну, чаму б ня выпусьціць таго слоўніку? Хібы можна было б паправіць перад выданьнем (у іх ужо зьявіліся кампутары). А маючы нешта, можна было б ісьці далей і лепей. Дык не! Ім давай са знакам якасьці адразу. Ці нічога. У выніку за 11 гадоў незалежнасьці — нічога. А ёсьць жа нямецкі слоўнік зроблены. Францускі. Не на афіцыйную замову. На генэтычную. Думаю, тузін моваў набраўся б. Дык штампуюць «рас.-бел.», «бел-рас.».

Але ня ўсё пагана. Ёсьць у мяне шчэ некалькі слоўнікаў. Італьянска-беларускі тысяч на 12. Партугальска-беларускі. Іншыя. Трэба нешта выдаваць, але ня з нашымі самаедамі.

**Мікола Бусел, Дуброва**

Лявон Вольскі

# Таму што ты — беларускі літаратар



Як выйшла, што ў нашай асобна ўзятай краіне пэўная колькасьць насельніцтва ўпарта не зважае на існаваньне беларускае мовы? Як здарылася, што яна (гэтая пэўная колькасьць) лічыць (працьму ўжо гадоў) нашую мову калгаснай, грубай, каструбаватай? Яна (гэтая колькасьць) стварыла сабе зручную легенду: «па-беларуску правільна размаўляць ніхто ня ўмее». З гэтым ты сутыкаешся, гаворачы з так званым «простым людам» на вуліцы, у мэтро, у таксоўцы. Маўляў, ты гаворыш непісьменна, бо пісьменна па-беларуску гаварыць ніхто ня здольны. І толькі ў якой бяседзе раптам малазнаёмыя людзі (звычайна жанчыны) заўважаюць: «Вось малады чалавек вельмі прыгожа размаўляе па-беларуску». Гэта зазначаецца зьдзіўлена й узьнёсла. Далей ідзе доўгая, нецікавая табе сто ці болей гадоў гутарка пра родную нашую матчыну мову, карані, гаротную нашу зямельку й цябе-малайца, які шануе й захоўвае, дый наагул робіць блізкі да гераізму ўчынак.

Як ім растлумачыць, што за доўгія гады карыстаньня гэтай моваю табе папросту значна лягчэй выказваць ёю свае думкі й пачуцьці, чымся нейкай іншай. Раней на пытаньні, чаму гаворыш па-беларуску, ты пачынаў доўгія тлумачальныя прамовы. Суразмоўца не скараўся, завязвалася бязглуздая дыскусія, у якой нараджалася ня ісьціна, а ўзаемнае непрыманьне. Цяпер жа ты гаворыш: «Таму што я — беларускі літаратар». Пытаньні зьнятыя. Бо народ памятае яшчэ эпоху, калі была эліта — паэты зь пісьменьнікамі — і ім дазвалялася размаўляць па-тутэйшаму. Іх паважалі. Хоць і не разумелі.

Як здарылася, што беларускі асяродак пераўтвараўся ў кола эмігрантаў у сваёй роднай краіне? Гаворачы па беларуску паўсюль — ва ўсіх момантах свайго звычайнага жыцьця, гэтыя людзі (ну, ня ўсе, натуральна, але большасьць) замкнуліся на сваёй асобе, у лепшым выпадку на сваёй сям'і, на кантактах з сама болей двума дзясяткамі аналягічных асобаў. Не, у гэтым коле ідзе сваё жыцьцё, выдаюцца кнігі, газэты, ёсьць свая музыка, свае навучальныя ўстановы… Усяго гэтага вельмі мала. Як у нацменшасьці. Адсюль — злосьць, агрэсіўнасьць, расчараваньне, няспраўджанасьць у жыцьці. Чалавек, што выходзіць за межы кола, ідзе ў бізнэс, дзяржаўныя структуры, рэдка вяртаецца назад. Дый наўрад ці яго прымуць.

«Нацменшасьць» пагарджае «простым народам», што выракся карянёў, плюе на сваю мову, звычаі, традыцыі, культуру. «Просты» ж народ пагарджае імі — «зацыкленымі», кепска апранутымі, вечнымі студэнтамі, зь іхнымі агрэсіўнымі прамовамі, нікому не зразумелымі, і бунтарскім агнём у вачох (вар'яты!).

Чаму ніхто ня робіць кроку насустрач свайму народу? Чаму энэргія ідзе даастачы на сваркі, на міжсобныя й усялякія іншыя разборкі? Чаму ўсё болей ворагаў сярод сваіх, а на чужых ужо не стае часу? Як здарылася, што асобы нашых лідэраў сталіся дробнымі ды адыёзнымі? Чаму іх ніхто не ўспрымае?

> Народ думае: дзяржава ў нас моцная, калі-нікалі й пакараць можа. Пры тым, што бальшыня таго народу крадзе, парушае й злоўжывае. Сада-маза? Затое ёсьць пачуцьці.

Варта было на хвіліну разысьціся з Масквой, як усе загулі: «Вось нарэшце ён нешта пачынае разумець, ён мяняецца да лепшага, бо ж лепей свае нягеглыя, чымся чужыя — якія яны там ні ёсьць! Хутка ўсё памяняецца».

Нічога ня зьменіцца. Ніхто нічога не пачынае разумець, бо ўсе ўсё даўно вырашылі дачынна кірункаў, вэктараў і аўры сваёй дзейнасьці. Зразумейце: калі ва ўладзе будуць тыя самыя людзі, дык будзе ўсё тое самае — гіпэртрафаваная дружба з Масквой, палацы рэспублік, лядовыя палацы, спорт і рэспубліканскія сьвяты з шашлыкамі й гарэлкаю.

Ты выходзіш на шырокую аўдыторыю, мільгаеш у тэлевізіі, штосьці гаворыш па радыё… Цяпер цябе слухаюць, ты можаш пра нешта гаварыць «нібыта кампэтэнтна», накідаць сваё меркаваньне. А твае меркаваньні, напрамкі твае дзейнасьці й твая ўнутраная аснова за гэтыя гады гэтаксама не зьмяніліся, як не зьмянілася нічога й у адказных высокіх дзяржаўных асобаў. Чаму ж твае былыя аднадумцы так кепска да гэтага ставяцца? Чаму яны лічаць, што ты прадаўся, «апапсеў», ужо зусім ня той, што раней? Таму што ты цяпер належыш ня толькі іхнаму вузкаму колу. Але ж вы калісьці разам імкнуліся да гэтага — выйсьці на шырэйшае кола, на агульнабеларускую прастору, каб вас нарэшце пачула як мага болей людзей! Што ж здарылася? Чаму тое, што ў палякаў пачалося зь перамогаю, у нас цягнецца пад прыгнётам, і вядуцца дзьве вайны: з чужынцамі й сваімі — паралельна. А з таго палкі замучаныя дашчэнту, сядзяць у акопах, брудныя, вашывыя й галодныя. Арыенціры страчаныя (ня тое, што ў кіраўнікоў дзяржавы); з чаго пачыналася вайна, ніхто не памятае; ідэалы згубілі свой бляск — адно роспач і злосьць. «Мы не вінаваты, вінаваты яны, вінавата сытуацыя, вінавата кіраўніцтва, кепскае надвор'е й беларускі народ».

Ніхто ня любіць народу: ён і «тупы», і «дурны», і «шэрая маса». Таму й народ нікога ня любіць. З тых, хто ня любіць яго. А дзяржава яго любіць. Яна яго ўхваляе, гаворыць, што ён — самы лепшы ў сьвеце й усё ў нас тут вырашае: як ён скажа, так і будзе. Бо народ — працавіты, памяркоўны, гасьцінны, гаспадарлівы. Народ-працаўнік. Таму народ любіць дзяржаву пад чырвона-зялёнымі сьцягамі. Нейкага прадстаўніка народу — раз! — і пасадзілі. Надоўга. Бо краў (злоўжываў, перавышаў паўнамоцтвы, парушаў…). Народу й гэта даспадобы. Народ думае: дзяржава ў нас моцная, калі-нікалі й пакараць можа. Так і мусіць быць. Пры тым, што бальшыня таго народу крадзе, парушае й злоўжывае. Сада-маза? Затое ёсьць пачуцьці.

Нікога ты не пераканаеш. Усе даўно перакананы. Кожны мае свой стрыжань, і стрыжань гэты ва ўсіх розны — злосьць, роспач, хітрасьць, любоў… Дык чаму ты пішаш пра ўсё гэта? Ведаеш, чаму? Таму што ты — беларускі літаратар.

**«Наша Ніва» / Радыё «Рацыя»**

Натальля Судлянкова

# Сутыкненьне цывілізацыяў

## Эміграцкае апавяданьне

Яе фігура пакідала незабыўнае ўражаньне. Са сьпіны Марыяна выглядала як гіганцкі перакулены знак віны на картах: вузкія плечы, асіная талія і азадак. Вялізны і неспадзяваны.

У лягер уцекачоў Марыяна трапіла выпадкова. Яна, чыстакроўная грузінка, жыла ва Ўкраіне, мела нейкі палатачны бізнэс у Расеі і ні ў чым сабе не адмаўляла. Пасьля дэфолту працаваць стала нашмат цяжэй, і Марыяна, начытаўшыся абвестак кшталту «Вы яшчэ пасьпееце прапісацца ў Эўразьвязе!», прыехала ў Чэхію. У выніку — змарнаваныя час і грошы, страчаныя ілюзіі, дэпрэсія і роспач. Калі яна аддала апошнія даляры на фальшывы чэскі пашпарт і яе падманулі, нейкі добразычлівец параіў няшчаснай падацца ў лягер уцекачоў.

Яна даведалася ў паліцыі адрас, трэслася цэлы дзень у цягніках, прыехала ў карантын, села ля брамы і заплакала ад вусьцішы і безвыходнасьці. Паліцыянту, які падышоў да яе, Марыяна расказала, як на споведзі, усю сваю гісторыю. Той, уражаны яе фігурай, прасякнуўся спагадаю. Ён навучыў Марыяну, што казаць падчас допыту, а пра што маўчаць, і, правёўшы ўсе ўступныя працэдуры, адчыніў перад «віновай дамай» дзьверы ў карантын.

Там, а пазьней у лягеры было спакойна і сыта. Пакуль Марыяна не сустрэла на шляху да сталоўкі Джона.

Джонам яго называлі ўсе, сапраўднага імя ніхто нават вымавіць ня мог. Джон быў цыбаты-цыбаты, як чапля, мэтанакіраваны, няўрымсьлівы, ахвочы пагаманіць, забясьпечаны, упадабаны публікай і чорны, як вакса.

У яго родным нігерыйскім племені памер жаночага азадка быў сымбалем дабрабыту і заможнасьці сям'і. Але нават у ягоным племені, што культывавала максымальныя габарыты, не сустракаў ён такога сымбалю, як у Марыяны.

Джон закахаўся адразу, рашуча і незваротна.

Марыяна спалохалася адразу, адчайна і беспрасьветна.

Джон быў «перавозчыкам» — ладзіў нелегальны транзыт уцекачоў празь мяжу. У лягеры ён бываў двойчы на тыдзень. Увесь астатні час за Марыянай сачылі ягоныя памагатыя. Праз пару тыдняў Джон зрабіў Марыяне прапанову. Менавіта яе не ставала яму для адчуваньня паўнаты жыцьця.

«Віновая дама» адмовіла.

Праз тыдзень закаханы перавозчык яшчэ раз прапанаваў злучыць лёсы. Марыяна з жахам, калыхаючы ніжняй часткай тулава, уцякла. Джон захоплена глядзеў усьлед закаханымі вачыма.

А потым пачаў дзейнічаць.

Сярод уцекачоў-афрыканцаў у лягеры быў шаман. Джон пайшоў да яго па нагаворнае зельле. Шаман узяў за працу зусім няшмат, але да справы падышоў добрасумленна.

Некалькі дзён запар ён выконваў пад акном Марыяны, якая трымцела ад страху, рытуальныя скокі, падвываў, кідаў у прачыненую (зашчэпка была загадзя зламаная) фортку матылёў, жукоў, пер'е, тушкі яшчарак, абпаленыя галінкі і іншае сьмецьце. Марыяна, хліпаючы, выносіла ўсё гэта ў калідор і марыла ўцячы за мяжу. Але зрабіць такое можна было толькі з дапамогаю Джона. Ён жа прапаноўваў Марыяне зусім іншае замежжа.



Раптам яна пачала сьніць яго. Чорны твар зь сьляпуча-белымі зубамі раптоўна ўсплываў перад вачыма і ўдзень, і ўночы. Празь некалькі дзён Джон падаўся ёй сымпатычным, а яшчэ праз тыдзень яна раптам згадала, што яшчэ ў школе хацела пабачыць Кіліманджара. Часам, ідучы ў сталоўку, Марыяна бубніла пад нос: «А ў Афрыцы, а ў Афрыцы, на сіняй Лімпапо…» Радзейшыя зьяўленьні шамана ўжо не жахалі.

На яе стан пачалі зьвяртаць увагу сулягернікі. Хтось цішком пасьмейваўся, хтось круціў пальцам ля скроні, уцякачкі з Уралу ўпотайкі зайздросьцілі наяўнасьці багатага і пэрспэктыўнага жаніха.

Адна курдзянка Тамара (так яна называлася, не жадаючы, паводле мусульманскай традыцыі, выдаваць сапраўднае імя) сур'ёзна ўстурбавалася станам сваёй найлепшай прыяцелькі. І ў адзін з момантаў душэўнага прасьвятленьня Марыяны, калі чары ненадоўга страцілі сілу, прапанавала дапамогу.

Тамара вырасла высока ў гарах і ўспадкавала ад бабулі знахарскія таямніцы. Яна паліла нейкія пахучыя сьвечкі ў пакоі Марыяны, кідала ў агонь жукоў і матылёў, нават спрабавала падпаліць хвост здохлай яшчарцы, што згубілася ў куце. Распусьціўшы касу, Тамара нешта бубніла, круцілася, прытупвала, махала рукамі, закочвала вочы і ўскідала галаву. Потым, зьнясіленая, павалілася на ложак і выдыхнула: «Усё!»

Тае начы Марыяна сьніла Джона апошні раз. Ён быў сумны, нібы працягваў рукі, клікаў здалёк, за ім у далечыні была відаць вяршыня Кіліманджара і плаўна нёс свае воды Нігер з кракадзіламі...

Джон адразу зразумеў, што здарылася, пасварыўся з шаманам і пайшоў на два месяцы ў Нямеччыну. А Марыяна занудзілася. Ёй не ставала ня тое каб самога Джона, але той дзіўнай салодкай зьнямогі, якая апошнімі тыднямі складала самую існасьць ейнага жыцьця.

Убеленая сьнегам Кіліманджара павольна зьнікла за недасяжнай сіняй школьнай смугою.

**Прага.**

**ВІТАНЬНІ**

**Каханую Надзейку** з Браслава віншую з Днём народзінаў. Влодэк

**Спадарыню Межавец Кацярыну** віншую з народзінамі. Сапраўды віншую. Дрэнны чалавек Aleś Pilecki

**Віншую** з Днём сьвятога Валянціна ўсіх сьвядомых беларусак, якія пажадалі зьвязаць сваё жыцьцё зь немцамі, туркамі, курдамі, арабамі, мурынамі, татарамі і прадстаўнікамі іншых «братніх славянскіх народаў». Алесь

**КАНТАКТЫ**

**«Жывіце** як дзеці». Гіпі

**Пакінь турботы** свае Госпаду, і Ён падтрымае цябе. (Пс.54:23)

**Дзякуй** сп.С.Дубаўцу, С.Харэўскаму, Т.Поклад за «avers» — артыкулы зь Вільні, але хацелася б ведаць і пра «revers» — чаму скарацілі беларускую праграму на TV, чаму не выходзіць газэта «Рунь», як жывецца беларусу ў Вільні?! Янка Талпыга

**Прадаю** радыё «VEF-202», фотаапарат «Зэніт-ЕТ». Т.: 273-00-85. Антон

**Гурток краязнаўства** «Менскія чарапахі» запрашае навучэнцаў 5—9 клясаў. Нядзеля: 10.00—15.00, серада: 14.00—19.00. Месца — клюб «У сьвеце жывой прыроды»: вул.Байкальская, 3. Т.: 242-03-31, 257-42-71 (х)

**Юрася Цітовіча** 1983 г.н. прашу адгукнуцца і патэлефанаваць. Т.: 254-77-59 (Аляксей)

**КВАТЭРА**

**Тэрмінова** здымем 1-пакаёвую кватэру для сябе на доўгі тэрмін. Разгледзім любыя варыянты. Тэл. (8-0297) 50-84-19

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**Прадам** кнігу В.Ластоўскага «Кароткая гісторыя Беларусі», 1993 г. Т.: 254-77-59 (Аляксей)

**Вазьму напракат** ці куплю CD «Пашпарт грамадзяніна NRM». Т.: 272-22-78. Кацярына

**ПРАЦА**

**Рэпэтытар** (ангельская мова). Т.: 263-71-79. Алеся

**Сумленнае рэпэтытарства** па беларускай мове і літаратуры. Выкладчык ВНУ і школы. Т.: 268-14-35

Віншуем Галіну, Маргарыту і Паўла Абрамовічаў з нараджэньнем дачкі й сястрычкі Адэляіды.

Нашаніўцы

НАДВОР'Е

# Люты

Апошні месяц зімы мы называем лютым. Гэтаксама яго завуць і суседзі — палякі ды ўкраінцы. У лютым самыя злыя вятры, мяцеліцы празь дзень, але тэмпэратура пакрыху падвышаецца, асабліва на Палесьсі — за кошт больш высокага сонца. У апошнія 30 гадоў люты часта быў цёплым. Так, у 1990 г. сярэдняя тэмпэратура на поўдні краіны склала + 4°С. Здараюцца й анамаліі: паветраныя масы з Атлянтыкі ці Паўночнай Афрыкі выклікаюць адлігі й сапраўдныя веснавыя пацяпленьні да +15…+17°С. У 1974 г., напрыклад, на Палесьсі ў першай дэкадзе лютага сышоў сьнег, а пасьля 20-га зямля прагрэлася настолькі, што можна было араць. Летась 3 лютага слупок тэрмомэтра ў Менску паказваў вышэй за +10 °С (на 15°С больш за норму).

Бывае, на зьмену цёплым паветраным масам прыходзяць іншыя, з Арктыкі — і вось тады тэмпэратура можа зьніжацца да -30… -35°С. На шчасьце, здараецца такое вельмі рэдка. Так, -35 °С фіксавалася 1 лютага 1965 г.

Канец зімы — час шлюбных гульняў у ваўкоў, зайцоў ды лісіц. А вось для казуляў і маладых дзічкоў гэта вельмі цяжкі час — асабліва на ўсходзе краіны, дзе сьнегу болей і бракуе харчаваньня. Дый ваўкі ня сьпяць.

Па лютым заўсёды варажылі на лета. Калі на праваслаўныя Грамніцы (15 дня) адліга — вясна будзе раньняя ды цёплая («Калі на Грамніцы певень нап'еццa вадзіцы, дык на Юр'я наесца травіцы»), а лета сьцюдзёнае («Як на Грымніцы адліга, з ураджаю будзе хвіга»). Калі халодна — тады вясна халодная, а лета цёплае. Сьнег падае — да доўгай і халоднай вясны.

**Юры Фралоў**



ТАЦЦЯНА СКАРЫНКІНА

# Сабака і Граждан сьвяткуюць Дзень закаханых

**Адзін сабака падараваў** сваёй сяброўцы ў Дзень сьвятога Валянціна бел-чырвона-белы букет. Граждан, убачыўшы гэта, патэлефанаваў куды трэба і сказаў: «Па маіх прыкметах, у горадзе арудуе Пазьняк!»

**Адзін сабака прызнаўся** сваёй сяброўцы ў каханьні на Дзень сьвятога Валянціна. А Граждан сказаў ім: «Я, як член прафсаюзаў, паведамляю вам, што любоў — гэта толькі срэдства сэксуальнай прыцяжальнасьці несавяршэнналетніх працівапаложнасьцей, і вы яшчэ будзеце плакаць і ўспамінаць бясцэльна прожытыя годы…»

**Адзін сабака напіўся** ў Дзень сьвятога Валянціна. Граждан пабачыў і сказаў: «Калі я замярзаў у партыйных лясах, дык у вражаскіх рэстарацыях усякія дзезерціры прапівалі Родзіну, як швэды над Палтавай».

**В.А.**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Сьвяточны шпацыр

Тыя, хто сумяшчае каханьне з чытаньнем, могуць на Дзень сьвятога Валянціна наведаць **выставу «Кніга бязь межаў»** у бібліятэцы НАН (вул. Сурганава, 15). Выдатная магчымасьць пакапацца ў пэрыёдыцы, што рассылаецца па сетцы Міжнароднага кнігаабмену, пабачыць навінкі беларускіх выдавецтваў. Багата там польскай навуковай літаратуры, прысьвечанай досьведу эканамічных рэформаў. Так што і сяму-таму з ураду карысна было б зайсьці.

Не зацікавіць — ад плошчы Якуба Коласа а 17-й пачнецца сьвяточнае **шэсьце «Маладога фронту»**. Пасольствы гэтым разам абыходзіць ня будуць — пакіруюцца на «карнавальны мітынг» да Опэрнага. Што вельмі дарэчы, бо ўвечары там даюць **«Трубадура» Джузэпэ Вэрдзі**. Калі ж квіткі (да сямі тысячаў) будуць не па кішэні, суцешце свайго каханага(ую) тым, што запросіце 19-га на «Рыгалета» таго самага Вэрдзі. Там таньней.

Калі й туды квіткі пападуцца задарагімі — проста шлях вам на плошчу Бангалор, дзе а 16.30 пачнецца традыцыйная акцыя Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларускай пад лёзунгам **«Заробак — на ўзровень цэнаў!»** Пацыфісты могуць застацца ў парку Дружбы народаў да наступнага дня, на які Леанід Козік заплянаваў акцыю пратэсту супраць вайны з Іракам і дабрачынны канцэрт з удзелам беларускіх выканаўцаў. Але **Фінберга** там ня будзе. 14-га ён з сваім аркестрам выступіць **у Смалявічах.** Будзе жаданьне паслухаць гітару Сяргея Анцішына — прыходзьце!

А жыхары Кастрычніцкага раёну сталіцы, якім не захочацца 14-га нікуды йсьці, могуць **патэлефанаваць у родную адміністрацыю**, што ладзіць простую тэлефонную лінію. Нумары — 216-13-60 (аддзел занятасьці) і 231-71-17 (адзел жыльлёвае палітыкі).

## Фэст дакумэнтальнага кіно

**Фэст дакумэнтальнага кіно «Адзін сьвет» будзе складацца з 10 фільмаў.** Працоўная формула фэсту — гадзіна кіно плюс 40 хвілінаў дыскусіі. Фільмы асьвятляюць падзеі ў «гарачых кропках» («Галасы з Востраву свабоды», «Тыбэт — страчаныя людзі») і апавядаюць пра дзейнасьць арганізацыяў кшталту «Greenpeace». Фільмы будуць дэманстравацца ва Ўправе БНФ (Варвашэні, 8) ад 19 лютага да 1 сакавіка штодня, апроч нядзелі. Пачатак а 18-й. Уваход вольны.

## У тэатры Мазынскага прэм'ера

**21 і 22 лютага тэатар «Вольная сцэна» і рэжысэр Валеры Мазынскі запрашае ўсіх ахвотных на прэм'еру спэктаклю «Водбліск далёкай маланкі».** Спэктаклі адбудуцца ў Доме вэтэранаў (вул.Янкі Купалы, 21). Пачатак а 19-й. Квіткі каштуюць 3—5 тыс. рублёў.

## Барокавая музыка

**19 лютага ў Доме вэтэранаў (вул.Янкі Купалы, 21) выступіць баранавіцкі гурт «Кантраданс».** У праграме — «Полацкі сшытак» (музыка Рэнэсансу і Барока). Таксама ў час канцэрту можна будзе пачуць лютневую музыку ў выкананьні Юр'я Дубнавіцкага зь Пінску. Пачатак у 19.00. Кошт квітка 4000.

## Гардкор у «Рэактары»

**20 лютага ў клюбе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) адбудзецца фэст «HARDCOREманія: чаду!» з удзелам гуртоў «Zet», «Лялькі», «Partyzone».** Кошт квітка 5500 (танцпол), 7000 (за столікам). Пачатак а 19-й.

Газэта дзякуе за падтрымку спадарам Эльжбеце Смулковай, Сяргею Дубаўцу.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Гісторыя Беларусі ў эўрапейскім кантэксьце:** Матэрыялы гістар. сэмінараў, якія адбыліся ў Менскім міжнар. адукац. цэнтры ў 2001 г./ Уклад. В.Астрога, У.Калаткоў; Пад рэд. Н.Стужынскай.— Менск: Адукацыя і выхаваньне, 2002. — 184 с.

Матэрыялы зборніка тычацца малавядомых старонак нашай мінуўшчыны ды скіраваныя на адлюстраваньне беларускіх падзеяў у сьвятле агульнаэўрапейскай гісторыі. Сярод узьнятых тэмаў — канфэсіі ў Беларусі ад часоў Вялікага Княства да сёньня, узаемаадносіны Беларусі й Літвы ў 1918—24 г., Беларусь у пэрыяд таталітарызму ды іншыя. Знайсьці зборнік можна ў «Акадэмкнізе». Наклад абмежаваны.

**Марачкін А. Алесь Мara:** Аўтаманаграфія. — Менск, 2002.

Гэты альбом — арыгінальны літаратурна-мастацкі праект, ці, паводле азначэньня самога аўтара, «АРТ-раскоп». Побач з рэпрадукцыямі твораў Аляксея Марачкіна тут зьмяшчаюцца ягоныя вершы, дзёньнікавыя запісы, старыя й новыя сямейныя здымкі, матэрыялы з архіву мастака. Альбом вызначаецца якаснай паліграфіяй. Наклад 290 асобнікаў. Пабачыць «Аўтаманаграфію» можна на кніжнай выставе ў сядзібе ТБМ.

**Панчанка П. Жытнёвы звон: Выбранае** / Уклад. З.Панчанкі. — Менск: Мастацкая літаратура, 2002. — 335 с.

У чарговай кнізе з сэрыі «Беларуская паэзія XX ст.» сабраныя творы Пімена Панчанкі. У зборнік увайшлі вершы з кніг «Пры сьвятле маланак», «Дзе начуе жаваранак», «Маўклівая малітва», «Крык сойкі», «Вячэрні цягнік», а таксама творы ваеннага часу. Цана — каля 5000 руб.

**Плыткевіч С. Беларуская экзотыка** — **Belarusian Exotics:** Фотаальбом. — Менск: Рыф тур, 2002. — 160 с.: іл.

Выданьне для тых, хто ўмее зьдзіўляцца й бачыць незвычайнае ў штодзённым. Аўтар падарожнічаў па Беларусі, наведаў Белавескую пушчу, Браслаўскі ды Нарачанскі нацыянальныя паркі, Бярэзінскі запаведнік, а таксама многія беларускія мястэчкі й вёскі. Фатаздымкі, сабраныя ў альбоме, — арыгінальны мастацкі погляд на сучасную беларускую рэчаіснасьць, у якой перапляліся бляск і мізэрнасьць. Выданьне можна прыдбаць ва ўсіх буйных менскіх кнігарнях. Цана — 22000 руб.

**Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.** / Перакл. на суч. бел. мову А.Шагун. — Менск: Беларусь, 2002. — 257 с.: іл.

Нарэшце дзеля таго, каб пазнаёміцца са славутым помнікам нацыянальнай юрыдычнай думкі XVI ст., ня трэба расшукваць факсымільнае выданьне ды вывучаць асаблівасьці старажытнабеларускае мовы. Накладам 2000 асобнікаў, з разьлікам найперш на чытача-неспэцыяліста выйшаў поўны пераклад Статуту на сучасную беларускую мову. Выданьне дапоўненае прадмоваю й адбіткамі асобных старонак з арыгіналу 1588 г. У кнігарні выдавецтва «Беларусь» (пераход ст.м. «Плошча перамогі») кніга каштуе блізу 5000 рублёў.

**Сыракомля У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, дасьледаваньні гісторыі, звычаяў**. — Менск: Мастацкая літаратура, 2002. — 205 с.: іл.

Асобнаю кнігаю выйшлі нататкі Людвіка Кандратовіча пра Менск, Мір, Нясьвіж, Стоўпцы, Койданава. Гэтая каштоўная краязнаўчая крыніца пераносіць чытача ў Беларусь сярэдзіны XIX ст. Упершыню частка Сыракомлевых запісаў друкавалася па-беларуску ў 1993 г. у зборніку ягоных твораў «Добрыя весьці».

**Цітоў А. Менск — горад майстроў: Рамесныя цэхі XVI—XVIII ст.** — Менск: Беларусь, 2002. — 110 с.: іл.

Кніга асьвятляе цікавую й да сёньня маладасьледаваную старонку гісторыі Менску. У форме нарысаў аўтар распавядае пра дзейнасьць рамесных брацтваў-цэхаў — ткачоў, краўцоў, шаўцоў і г.д. Асобныя разьдзелы прысьвечаныя гісторыі першых менскіх мэдычных установаў.

**Тацяна Вабішчэвіч**

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

**Тэкст** __________

**Імя і прозьвішча** __________

**Адрас, тэлефон** __________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3831.

Нумар падпісаны ў друк 12.02.2003.

Замова № 826.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а